Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 473. Рэдактара—№ 763.

Матар'ялы прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: Па 1 месяц — 90 к. • 3 • — 2 р. 70 к. • 6 • — 4 р. — к. • 1 год — 8 р. — к. Замежа адносн. ісмагародзяя — 20 к. мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапкарай пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапкарай паперэд тэксту 1 р. — к. За радок шапкарай перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпецыяльна на 50 проц. дарожэй. Зьмяшаны тарыф бярэцца 10 проц. даўгаты.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 радок . . 35 кап. За кожны радковы . . 15 „ Воспрацоўк. і чырвонаармейцы за радок . . 15 „ За кожны радковы . . 5 „ Публікацыі ЗАГСу—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА у канторы газэты, на ўсіх адасобленых Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 ГОД ВЫДАЧЫ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 6 (2435 Серада 9-га студзеня 1929 г.

Аб правядзеньні 5-й гадавіны з дня сьмерці У. І. Леніна.

У разьвіцьцё адозвы ЦК УсеКП(б) аб правядзеньні 5-й гадавіны з дня сьмерці Леніна, сакратарыят ЦК пастанаўляе:

1. Зьвязаць правядзеньне 5-й гадавіны з дня сьмерці У. І. Леніна з папулярызацыяй асноўных бягучых задач партыі: індустрыялізацыі краіны, індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскае гаспадаркі, падняцьця ўраджайнасьці, перавыбараў саветаў і барацьбы за ленінізм, супроць правага ўхілу, трацкізму і прымірэнцтва.

2. Скарыстаць ленінскія дні для пашырэньня і паглыбленьня інтэрнацыянальнага выхаваньня і зблізьненьня працоўных розных нацый у БССР.

3. 21 студзеня на прадпрыёмствах склікаць агульныя сходы рабочых, а на вёсцы—сходы сялян (батракоў, бяднякоў і сярэднякоў), на якіх паставіць даклад партыйчэйкі аб сваёй рабоце з пункту гледжаньня вызначаных у адозьве момантаў.

4. Прыўрочыць да гэтых дзён прыём новых рабочых, работніц, батракоў, батрачак у партыю і правесьць магчымасьць вылучэньня новага актыву з рабочых, батракоў і бедноты, асабліва жанчын.

5. З 20 па 27 студзеня склікаць пасяджэньні саветаў у горадзе і на вёсцы з удзелам парт. праф. і іншых грамадзкіх арганізацый з дакладам на тэму «Пяць год сацыялістычнага будаўніцтва па зветах Ільліча».

6. У клюбах, нарадамох, хатах-чытальнях і бібліятэках арганізаваць выстаўкі ленінскай літаратуры і аб Леніне.

7. Упарадкаваць у гэтыя дні ленінуткі і праверыць работу ўсіх устаноў, якія носяць імя Леніна.

8. 22 студзеня ў клюбах, нарадамох хатах-чытальнях арганізаваць вечары, прысьвечаныя 5-й гадавіне з дня сьмерці Леніна з наступнымі зьместам: 1) Чым вызначаўся Ленін для пралетарыяту і працоўных мас (даклад); 2) літаратурна-мастацкая частка, зьвязаная з жыцьцём і сьмерцю Леніна.

9. Арганізаваць раніцы для дзяцей, прысьвечаныя 5-й гадавіне з дня сьмерці Леніна. Наркамасьвеце даць дырэктывы па сваёй лініі.

10. У друку, а таксама ў бюлетэні ЦК КП(б)Б зьмясьціць артыкулы і іншы матар'ял, папулярызуючы ленінізм, а таксама палітычныя вывучэньне твораў Леніна ў далейшым. Перадаць адпаведныя матар'ялы і літаратурна-мастацкую частку па рад 8.

11. АПА ЦК падрыхтаваць тэзісы для дакладаў і прыняць захады да арганізацыі адпаведных кансультацый пры АПА-габінэтах.

У Югаславіі ўведзен рэжым самаўладзтва.

УСЕ РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ АБВЕШЧАНЫ ПА-ЗА ЗАКОНАМ.

„Пераварот у Югаславіі—пачатак небясьпечнага крызісу з страшэннымі вынікамі для Эўропы".

Разгон харвацкае сялянскае партыі.

ВЕНА, 7-I. Учора агалошана афіцыёзнае паведамленьне югаслаўскага тэлеграфнага агенцтва «Авала», якое падкрэсьлівае, што дзяржаўны пераварот у Югаславіі адбыўся з мэтаю «захаваць дзяржаўную і нацыянальную адзінасьць», і што пераварот выклікан «непрымірымасьцю палітычных партый». Болыг слоў паведамленьня, «мяркуюць», што дыктатура «мае часовы характар і падрыхтуе новую ўнутрана-палітычную сыстэму", г. зн. новую канстытуцыю. У сучасны момант, на падставе дэкрэтаў караля, Югаславія ня будзе больш канстытуцыйнаю дзяржаваю і робіцца самаўладнай манархіяй. Адзін з каралеўскіх дэкрэтаў уводзіць новы закон «аб абароне дзяржавы», які абвяшчае па-за законам усе рэвалюцыйныя арганізацыі і распушчае усе палітычныя партыі «заснованыя на племянных і рэлігійных прынцыпах». На падставе гэтага учора ўжо распушчаны харвацкая сялянская партыя і басьнійская мусульманская партыя Спага. Скупшчына (парлямант) зачынена. Пропуск лопуцаў і нават службовых асоб у памяшканьні забаронен. Прэмер Жэўковіч заявіў, што сябры ўраду пада ён ня будуць давать віяхіх гутарак ці заяў для друку. Усе пастановы ўраду будуць агалошвацца выключна ва «Урадавым весьніку».

ВОДГУКІ У ФРАНЦЫІ НА ПЕРАВАРОТ.

ПАРЫЖ, 7-1. Увесь французкі друк выказвае непакой у зьвязку з магчымымі вынікамі дзяржаўнага перавароту ў Югаславіі. Правы друк выказвае пры гэтым надзею, што «за час існаваньня неканстытуцыйнага ўраду ўдасца дасягнуць згоды, якая замірыць агульнадзяржаўныя інтарэсы з патрэбамі асобных нацыянальнасьцяў і забясьпечыць палітычнае адзінства дзяржавы». Лева-буржуазны друк выказвае небясьпеку, што ваенная дыктатура і рапрэсыўныя захады ня толькі ня ліквідуюць крызісу, але могуць выклікаць «крывавую ўнутраную барацьбу, якую выкарыстаюць Італія і Вэнгрыя з мэтаю адкінуць Югаславію да Адрыятычнага ўзьбярэжжа».

Такія-ж думкі выказвае і сацыялістычны друк. «Популер» дадае, што «магчымае ўмешваньне Мусаліні і яго в ссылку у югаслаўскую грамадзянскую вайну выкліча адпор з боку вялікіх дзяржаў, і такім парадкам, дзяржаўны пераварот у Югаславіі адчыняе самы небясьпечны крызіс з незлічонымі вынікамі для ўсяе Эўропы».

Лідэры харвацкае апазіцыі здаволены пераваротам(?)

ГРАМАДЗКАСЬЦЬ ЗАГРЭБУ ЛІЧЫЦЬ ТАКТЫКУ ЛІДЭРАЎ КАПІТУЛЯЦЫЯЙ

ВЕНА, 7-I. Як паведамляюць з Загрэбу, на пасяджэньні генэральнае рады сялянска-дэмакратычнае кааліцыі Мачэк (лідэр харвацкае сялянскае партыі) заявіў, што ён «здаволен» пераваротам у Югаславіі, бо гэты пераварот азначае «скасаваньне цэнтралістскае канстытуцыі, пазбаўленьне ад сэрбскае ўрадавае кааліцыі і роспуск скупшчыны, якая была арэнаю забойства Радзіча».

У загрэбскіх палітычных колах зазначаюць, што яшчэ нябожчык Стэфан Радзіч прапанаваў у свой час каралю скласьці «ўрад генэралаў», як сродак для ліквідацыі крызісу, а таму харвацкія лідэры зараз «згодны» з учынкамі караля.

Не зважаючы на такія заявы лідэраў, на ўсім краі сярод шырокіх гушчаў панує вельмі прыдушаны настрой. Між іншым, у Загрэбе шырокія гушчы ня верацць, што ваенная дыктатура апраўдае надзеі лідэраў сялянска дэмакратычнае кааліцыі, і лічаць, што тактыка лідэраў, гэта—ні што іншае, як іх капітуляцыя перад дыктатурай. Пакуль-што яшчэ ням вестак аб уражаньні, якое выклікаў у Харватыі роспуск харвацкае сялянскае партыі.

Югаславія перад пэрспэктывай распаду.

ВЕНА, 5-1. З Белграду паведамляюць, што лідэры загрэбскае апазіцыі Мачэк і Прыбічэвіч былі прыняты каралём. Мачэк перадаў каралю мэмарандум з плянам дзяржаўнае рэформы Югаславіі. План гэты прапануе федэратыўны перадзел Югаславіі, аснованы на вучоце гістарычных і культурных асаблівасьцяў правінцый, якімі, водлуг плану, павінны кіраваць аўтаномныя ўрады і парлямянты. Прыбічэвіч ваў у больш умераную пазыцыю і патрабаваў толькі сфармаваць нэйтральны выбарчы габінэт, якому прапанаваў заручыць склік новага ўстаноўчага збору.

Пасьля гутаркі з каралём Прыбічэвіч заявіў журналістам, што, у выпадку аднаўленьня ранейшае ўрадавае кааліцыі, загрэбская апазіцыя „пярэйдзе ад слоў да справы".

Прадстаўнікі ранейшых урадавых партый у перамовах з каралём выказаліся проці харвацкіх патрабаваньняў.

Правакацыйныя выпады мукдэнцаў на Усх.-Кіт. чыгунцы.

ЗАЧЫНЕНА ГАЗЭТА „МОЛВА"

ХАРБІН, 6-1. Учора ўвечары паліцыя зачыніла газэту «Молва». Газэту абвінавачваюць у агалашэньні фэльетону наконт хваробы ангельскага караля. Агалашэньне фэльетону выклікала ўмешваньне ангельскага консула.

ПАХОД ПРОЦІ ПРАФСАЮЗАЎ.

ХАРБІН, 6-1. Мясцовы афіцыёз—газэта «Гун-Бао»—выступіў в двума артыкулами проці мясцовых прафсаюзаў, якія гуртуюць савецкіх рабочых і служачых, у зьвязку з іх эканамічнаю працаю у справе ўтварэньня калектыўных угавораў на савецкіх прадпрыёмствах, устанаўленьня разьлікавых кніжак на прыватных і г. д. Газэта заявляе, нібыта ўласны характар прафсаюзаў у адносінах да савецкіх грамадзян спэцыяльнага райёну 3-х усходніх правінцый і пажыў іх на гандлёва-прамысловыя прадпрыёмствы ў галіне палепшаньня ўмоў працы выклікалі занепад прамысловасьці ў Паўночнай Манчжурыі.

НАСТУП ВОЙСК АМАНУЛЫ НА ПАЎСТАНЦАЎ.

КАБУЛ, 7-I. Урадавае войска пачало наступ на Чарыкарскую лагчыну трыма калёнамі. Першыя вынікі наступу даволі пасьпешныя.

АБУРЭНЬНЕ АЎГАНСКАЕ ГРАМАДЗКАСЬЦІ ПРОЦІ ІНТРЫГ АНГЛІІ.

ТАШКЕНТ, 7-1. Аўганская газэта „Аніс", абураючыся проці палётаў ангельскіх вайсковых эраплянаў над Аўганістанам, піша: «Ужо ў працягу некальких дзён ангельскія самалёты робяць доўгія палёты над горадам, раскідаючы розныя лістоўкі. Жыхарства абурана гэтымі ўчынкамі ангельцаў, якія ў працягу дзесяці гадоў будуюць на нашай граніцы крэпасьці. Мы ведаем, што кожны крок ангельскага ўраду кантроляваны проці нас".

Газэта абураецца проці адозвы ангельцаў да паўстанцаў, у якой апошніх называюцца «рэлігійнымі арганізацыямі». «Называць паўстанцаў рэлігійнымі арганізацыямі—піша газэта значыць,—разьдзьмухваць полымя. Такія ўчынкі ангельцаў у адносінах да чароду, які яны самі называюць рэлігійным і адважным, ёсьць зьнавага, пагарда і ўмешваньне. Калі ня спынецца такія ўчынкі, дык мы будзем мець права гаварыць, што ангельцы шукаюць прычэпкі для ў броенага ўмешваньня».

СТАЎКА ПОЛЬШЧЫ НА УКРАІНСКУЮ БЕЛАГВАРДЗЕЙШЧЫНУ.

Між Варшаваю і Бухарэстам ідзе жвавы абмен думкамі аб адкадзе на ноту Літвінава.

Заснаваньне пятлюраўскіх банд у Польшчы.

БЭРЛІН, 7. Прасні карэспандэнт тэлеграфнага агенцтва «Ост Экспрэс» заяўляе: «У зьвязку з савецкаю прапановаю Польшчы, асаблівую зацікаўленасьць набываюць некаторыя новыя падрабязнасьці ўзмацненьня ўзбраеньняў патэмных мілітарыстскіх арганізацый Польшчы і Румыніі. На апошнім тыдні ў Дацыгу зноў прыбыло некалькі буйных французкіх транспартаў зброі і амуніцыі для Польшчы, якія былі накіраваны ў Станіславаў, Тарнопаль,—наогул у райёны пагранічныя з УССР.

Зноў узмацнілася актыўнасьць украінскіх белагвардзейскіх эмігрантаў у Польшчы. У палове студзеня ў Варшаве адбудзецца канфэрэнцыя ўсіх эўрапейскіх арганізацый пятлюраўцаў. Адначасова з канфэрэнцыяй будуць праведзены патаемныя нарады.

Паміж польскімі і французкімі вайсковымі коламі адбываюцца перагаворы аб скарыстаньні ўкр інскіх антысавецкіх эмігрантаў супроць СССР. Польскі міністр замежных спраў Залескі нядаўна прыняў былога міністра замежных спраў «Украінскай народнай рэспублікі»—Шульгіна.

У польскіх вайсковых колах сур'ёзна думаюць аб пляне пры дапамозе украінскіх эмігрантаў выклікаць у УССР непрадкі, спадзяючыся, што ў такім выпадку яны атрымаюць ад заходніх дзяржаў „мандат на вызваленьне Савецкай Украіны". У Кельцах, Новым-Мясьце, Тарнопалі ўжо фармуюцца вайсковыя часьці з украінскіх эмігрантаў. Найбольш выдатным кіраўніком арганізацыі украінскіх вайсковых часьцей зьяўляецца былы царскі афіцэр Салагуб. Актыўную дзейнасьць у гэтай галіне разгортвае польскі генэрал Сасноўскі.

У Бухарэсьце нэрвуюцца.

ВЕНА, 6-1. З Бухарэсту паведамляюць, што ў зьвязку з нотаю Літвінава ў Румыніі наглядаецца ўсё больш узрастаючая нэрвовасьць. Між Бухарэстам, Варшаваю, Парыжам і Лёндонам адбываецца абмен думак. Румынскі пасланьнік у Варшаве, які знаходзіцца ў сучасны момант у Бухарэсьце, вярочаецца ў Варшаву для перамоў з Шідсудзкім і Залескім.

Прыцельскі ўраду друк учора заяўляў, што Румынія ў бліжэйшы час ратыфікуе пакт Келёга, каб даць Савецкаму Саюзу магчымасьць запрасіць Румынію непасрэдна падпісаць пратакол.

Між 2-х зэдлікаў.

ВЕНА, 8-1. З Бухарэсту паведамляюць, што румынскі друк ня спыняе абмяркоўваць савецкую прапанову Польшчы.

«Дымінэца» піша: «Нота Літвінава Польшчы паставіла Румынію перад цяжкаю задачаю. З аднаго боку Румынія ня можа спрабаваць заснаваць вносны в Савецкім Саюзам, бо яна павінна лічыцца з настроем Англіі, якая магла-б назваць такі крок з боку Румыніі варожым. З другога боку, у сучасны момант Румынія ня можа дазволіць сабе вельмі вялікае стрымаваньці ў адносінах да савецкае прапановы, бо Савецкі Саюз спрабаваў-бы давесьці пажаданьне Румыніі ісьці насустрэч мірным прапановам. З гэтае прычыны ўрад намеран заняць пазицыю чаканьня, абапіраючыся на атрымане заявленьне ад Польшчы, што яна ні ў якім разе не дапусьціць расколу антыбальшавіцкага блёку".

Афіцыйная літоўская прапанова Латвіі

ДАЛУЧЫЦЦА ДА ПРАТАКОЛУ, ПРАПАНАВАНАГА СССР.

РЫГА, 7-I. Вячэрнія газэты паведамляюць, што сёньня літоўскі пасланьнік у Латвіі перадаў латвійскаму ўраду афіцыйную прапанову літоўскага ўраду далучыцца да пратаколу, які прапануе неадкладна надаць моц пакту Келёга.

Латвійскі друк, спасылаючыся на літоўскія крыніцы, перадае, што літоўскі зварот да Латвіі і Эстоніі зусім ня тлумачыцца страхам якога-небудзь нападу на Літву з боку гэтых двох краёў і прадыктован толькі жаданьнем захаваць у моцы ідэю салідарнасьці Балтыцкіх дзяржаў. Літва робіць сваю прапанову з агаворкаю, што яна будзе лічыць яе сапраўдным толькі ў тым выпадку, калі яе ўхваліць Польшча.

ФРАНКФУРЦКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ НА ПАЗІЦЫЯХ ПАДТРЫМАНЬНЯ ІМПЭРЫЯЛІЗМУ.

БЭРЛІН, 7-I. Пасьля таго, як выявіўся агульны характар міжнароднае пацыфісцкае канфэрэнцыі проці газавае вайны (якая склікана ў Франкфурце на Майне міжнароднай жаночай Лігай), дэлегацыя УЦСПС пастанавіла ўстрымацца ад удзелу ў канфэрэнцыі.

На сёньнешнім пасяджэньні канфэрэнцыі пэрсанальна прысутнічала толькі тав. Чарнышова, каб азнаёміць канфэрэнцыю з пунктам гледжаньня работніц СССР у пытаньні аб вайне. У сваей прамове тав. Чарнышова заявіла, што канфэрэнцыі накшталт франкфурцкае нічога ня могуць зрабіць проці вайны; для барацьбы проці ваеннае небясьпекі патрэбна абвясьціць вайну імпэрыялісцкай вайне, трэба ўзмацніць барацьбу проці капіталістаў і імпэрыялістаў, трэба мабілізаваць усіх сапраўдных ворагаў вайны. Пасьля спрэчак на галасаваньне была пастаўлена рэзалюцыя, прапанаваная кіраўнікамі канфэрэнцыі. Пад уплывам сацыял-дэмакратаў большасьць канфэрэнцыі ўхваліла папраўку, якая выключае з рэзалюцыі спасылку на савецкія прапановы аб разброеньні і заяву аб патрэбе рашуча падтрымаць гэтыя прапановы. На агульную думку, ухвала гэтае папраўкі адкрыта падкрэсьлівае згодніцкі характар канфэрэнцыі.

„Патомак Чынгіс-хана" ў Бэрліне.

БЭРЛІН, 6-1. Учора ў Бэрліне адбыўся першы прагляд савецкае кінокарціны «Патомак Чынгіс-хана». Карціна мела надзвычайны посьпех. Рэжысэру Пудоўкіну, які прысутнічаў у кіно, была наладжана бурная авацыя.

У Саюзных Рэспубліках

НЯМЕЦКІ ПАСОЛ У МАСКВЕ.

МАСКВА, 7-1. Учора а 2 гадзіне ў Маскву прыехаў новазазначаны надзвычайны і паўнамоцны пасол Нямеччыны ў СССР пан Гербэрт фон Дырксэн. Ад граніцы да Масквы пасла праводзіў сэкратар нямецкага пасольства пан Генке. На Беларуска-Балтыцкім в кзале пасол быў спатканы загадчыкам пратакольнага аддзелу НК Замежных Спраў т. Д. Д. Флёрынскім, загадчыкам аддзелу цэнтральнае Эўропы НК Замежных Спраў т. Б. Е. Штэйнгам і іншымі працаўнікамі НК Замежных Спраў.

ФОН-ДЫРКСЭН У Т. ЛІТВІНАВА.

МАСКВА, 7-1. Учора часова выконваючы абавязкі Наркома Замежных Спраў т. М. М. Літвінаў прыняў новазначанага пасла Нямеччыны ў СССР—фон Дырксэна.

УСЕСАЮЗНАЯ НАРАДА ГІСТПАРТАЎ.

2-Е І 3-Е ВЫДАНЬНІ ТВОРАЎ ЛЕНІНА БУДУЦЬ СКОНЧАНЫ ДА 1930 Г.

МАСКВА. У Інстытуце Леніна пры ЦК УсеКП(б) 5-га студзеня адчынілася пятая ўсесаюзная нарада загадчыкаў мясцовых гістпартаў. На нарадзе прысутні акрамя: т. т. Палямінскі, Люцянскі, Зілізараў, Самойлаў (Інстытут Леніна), Шахарадзе (ЗСФСР) і шмат прадстаўнікоў з мест.

З дакладам аб чарговых задачах І-стытуту Леніна і мясцовых гістпартаў выступіў Савельеў. Для Інстытуту Леніна кажа дакладчык,—бачна ю задачу зьбіраецца, як мага хутчэй, выпусьціць ленінскую літаратурную спадчыну — другое і трацце выданьне твораў Леніна. Засталося нявыданымі яшчэ 16 тамоў, якія, згодна дырэктывы ЦК УсеКП(б), павінны быць выпушчаны да канца 1929 году. Усе кадры Інстытуту Леніна і ўсе сілы магутнага „друкарскага двара" ў Ленінградзе кінуты на гэтую справу.

З даня дам аб працы гістпартаў выступі а т. Эссэн. За апошні год гістпарты пераходзяць ад выданьня ўспамінаў да выданьня дакумэнтаў і праці згодна архіўных матар'ялаў. За 1928 год гістпарты выдалі 198 выданьняў, з якіх дзьве трэці складаюць напалову дасьледы навуковых працы і хроніка. Недахопамі працы гістпартаў зьяўляецца некаторая адсутнасьць абэктывізму, замоўчваньне аб некаторых падзеях і фактах, якое часам не выклікаецца якімі-небудзь тактычнымі мэркаваньнямі, а таксама непатрэбнае «ахаяньне» ва ўспамінах г. зн. імкненьне выпукліць свае „я" і слабое асьвятленьне падзей і дзейнасьці арганізацый. Адначасна трэба адзначыць слабую ўвагу партарганізацый да гістпартаў.

Загадчыка Ленінградзкага гістпарту т. Кодзэ паведаміла нарадзе аб формах і зьмесьце працы рабочае грамадзкасьці нападоў гістпартаў у Ленінградзе. Там ва ўсіх раёнах і на ўсіх буйных фабрыках і заводах заснаваны гістпартаўскія камісіі, у якіх уваходзяць старыя рэвалюцыянэры бальшавікі, а таксама партыйцы і рабочыя, якія цікавяцца гісторыяй партыі. Вынікі гэтага вопыту ленінградзкага абласнога гістпарту будуць агалошаны.

Новыя прадпрыёмствы на 7-гадз. дзень.

МАСКВА. Урадавая камісія па падрыхтоўцы ажыцьцяўленьня 7-мігадзіннага працоўнага дню зацьвердзіла дадатковы сьпіс прадпрыёмстваў, якія павінны быць пераведзены ў другім квартале 1928-29 году на 7-мігадзінны працоўны дзень. Сьпіс ахапляе 19 прадпрыёмстваў, з якіх 13 прадпрыёмстваў каменна вугольнае прамысловасьці, 9—хімічнае і па адным прадпрыёмстве дрэвапрацоўчае, шкляное, кравецкае і паліграфічнае прамысловасьці. У лік гэтых прадпрыёмстваў уваходзяць такія: капальня № 5 Гарлоўскага рудакіраўніцтва (станцыя Гарлоўка, Данецкіх чыгунак), капальня № 23 Чысьцякоўскага рудакіраўніцтва (станцыя Чысьцякова Данецкіх чыгунак), капальня імя Вароўскага аб'яднанага Шахцінскага рудакіраўніцтва (капальні Паўночна-Каўказкага краю), капальня № 4 Вукаўскага рудакіраўніцтва (станцыя Антрацыт Данецкіх чыгунак), капальня Ліпеўка № 2 сёмага Краснатворскага рудакіраўніцтва (станцыя Рудчанкава, Капярнінскае чыгунка), капальня № 6 Краснапольле-Бранскага рудакіраўніцтва (станцыя Арлоўская, Данецкіх чыгунак), капальня «Коруны» Золата-Ташкоўскага рудакіраўніцтва (станцыя Маеўка, Данецкіх чыгунак), капальня «Чэгары» Шчарбінскага рудакіраўніцтва (станцыя Майёрская, Данецкіх чыгунак), Шчэцінскі рудзік—Масквавугаль (станцыя Шчэціна, Маскоўска-Курскае чыгунка) рудзік «Красный Профинтерн» Рыкаўскага камбінату, «Юсталь» (Янакіева, Арцемаўскае акругі), завод імя Вароўскага—Паўночны камбінат (Архангельск).

Выплаўка чыгуну павялічана ўдубальт.

ГУЛА, 6-I. Касагорскі чыгунна-плавільны завод падвоіў выплаўку чыгуну ў параўнаньні з 1927-28 г. Заводу пры двух доменных печах дадзена заданьне выплавіць 110.000 тон чыгуну замест 57.000 тон у 1927-28 г. Павялічан здобыч руды на 33 проц. Сабекошт тоны чыгуну-штыка зьніжан з 71 р. 1 к. да 64 р. 59 к., сабекошт руды зьніжаецца на 17,6 проц.

Новая экспэдыцыя Куліка.

ЛЕНІНГРАД, 5-1. Усесаюзная Акадэмія Навук намерана на працягу бліжэйшых тыдняў паслаць новую экспэдыцыю на чале з Куліком на Тунгузку, дзе скінуўся метэарыт. У тайзе будзе заснована астранамічны пункт; у далейшай працы ўхвалена карыстацца аэрафотаздымкаю, правесьці бурэньне вібраціе глебы ў варонках і навакол іх, пабудаваць рабочы дом і лодкі для патроў навуковых працаўнікоў.

Даклады вучоных СССР у Францыі.

МАСКВА, 7-I. Усесаюзнае таварыства культурнае сувязі з заграніцаю атрымала ад генэральнага сэкратара французкага камітэту навуковага зблiжэньня з СССР прафэсара Андрэ Мазона паведамлдньне, што камітэтам запрошаны ў Парыж для зачытаньня шэрагу дакладаў акадэмік С. Ф. Ольдэнбург, праф. біалёгіі Маскоўскага Унівэрсытэту М. К. Кальчоў і праф. Харкаўскага Унівэрсытэту С. М. Бэрштэйн. Праф. Кальцоў гэтымі днямі выехаў у Францыю, дзе ён між 15 і 25 студзеня прачытае два даклады.

Прафсаюзы на варце зьніжэньня сабекошту.

МАСКВА. УЦСПС зьвярнуўся да буйных мясцовых прафарганізацый з прапановаю ўзяць удзел у пачатай ВСНГ СССР кампаніі па зьніжэньні сабекошту прадукцыі. Прадстаўнікі прафарганізацый павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу на тое, каб зьніжэньне сабекошту адбывалася за кошт рацыяналізацыі вытворчасьці, лепшага выкарыстаньня абсталяваньня, своечаснае дастаўкі сыравіны, павялічэньня выпуску прадукцыі, правільнага размеркаваньня і выкарыстаньня рабочае сілы і тэхнічнага пэрсаналу, узмацненьня працоўнае дысцыпліны і г. д. Да гэтай працы павінны быць прыцягнуты вытворчыя нарады.

Размыў берагоў Керчанскае пратокі.

СІМФЭРОПАЛЬ, 7-I. Размыў Тузлінскае касы на Кубанскім беразе Керчанскае пратокі, які пачаўся ў канцы 1925 г., ня спыняе пашырэцца і пагражае вельмі сур'ёзнымі вынікамі гаспадарцы Керчанскага і Таманскага райёну. У выніку размыву плынь у канале (суднаходная частка пратокі) падзялілася на два рукавы, ход рыбы зьмяніўся, і рыбалоўству ў раёне пратокі ўчынена значная шкода. З прычыны размыву—лекавыя гразавыя вазёры на Тузлінскай касе могуць забруднецца. Нарэшце, працяг пагр[illegible] ыць умовы суднаходства ў пратоцы. Скліканая ў Керчы спэцыяльная нарада прызнала патрэбным у сёлетнім годзе замацаваць касцы прабоіцы і ўхіліцца гэтым ад далейшага размыву в тым, каб у наступныя гады зусім зачыніць размыў.

Газ з торфу.

ЛЕНІНГРАД, 7-I. На вопытным заводзе інстытуту прыкладнае хэміі хэмікам Курнаковым і інжынэрам Клінавым вырашана адна з важнейшых праблем нашае прамысловасьці — атрыманьне газу з торфу.

Палітычны крызіс у Францыі.

ГАБІНЭТ ПУАНКАРЭ НАПЯРЭДАДНІ РЭАРГАНІЗАЦЫІ.

ПАРЫЖ, 7-I. Не зважаючы на намер Пуанкарэ застацца ва ўладзе і падрыхтаваць разам з сучасным складам габінэту канкрэтную ўрадавую праграму, урадавы крызіс, як прызнае друк, яшчэ цягнецца, хоць і ў прыкрытай форме. З газэтнае палемікі выразна выяўляецца, што, як відаць, радыкалы выкажуць даверэ ўраду толькі пры ўмове далучэньня да праграмы патрабаваньняў радыкалаў у галіне ўнутранае і замежнае палітыкі. Гэтыя патрабаваньні прадугледжваюць зьмяншэньне падатковага цяжару для дробнае буржуазеі, ажыцьцяўленьне адзінае школы, захаваньне сьвецкага заканадаўства, скарачэньне вайсковага бюджэту і правядзеньне ў замежнай палітыцы прынцыпаў пацыфізму ў сэнсе паскораньня перамоў аб рэпарацыях і ўмацненьня прыяцельскіх дачыненьняў як з Нямеччынаю, так і са Злучанымі Штатамі і інш. Радыкальны друк заначае, што такая праграма ня можа быць ажыцьцёўлена ўрадам, у якім удзельнічаюць крайнія правыя. Згодна заявы «Эр Пуаль» справа ідзе не пра ўдзел ва ўрадзе радыкалаў поруч з правымі групоўкамі, а пра выбар між тымі і іншымі. Газэта мае зразумець Пуанкарэ, што сучасному ўраду давядзецца або замірыцца, або распачаць рэарганізацыю габінэту пад знакам палявеньня.

Хоць ніхто і ня лічыць, што ў выніку праграмных спрэчак 11-га студзеня ўраду будзе выказана недавер'е, аднак, у правых колах баяцца, а ў левых спадзяюцца, што Пуанкарэ не здаволіцца выключна праваю і да таго-ж назначаю большасьцю і распачне рэарганізацыю ўраду пад нажымам левага крыла самога ўраду і, у асобку, Брыяна.

ШЫРОКІ РАЗМАХ СЭНТ-ЭЦЬЕНСКАЕ СТАЧКІ.

БУРЖУАЗЕЯ І РЭФАРМІСТЫ ІМКНУЦЦА УЗАКОНІЦЬ УЖЫВАНЬНЕ ПРЫМУСОВАГА АРБІТРАЖУ Ў ПРАМЫСЛОВЫХ КАНФЛІКТАХ.

ПАРЫЖ, 7-I. У Сэнт-Эцьене (дэпартамант Луары) адбылася шматлікая дэманстрацыя бастуючых гарнякоў, прычым у дэманстрацыі ўзялі ўдзел таксама гарнякі некаторых акалічных рудзікоў. Нават паведамленьні буржуазнага друку прызнаюць значнасьць дэманстрацыі, зазначаючы, што лік удзельнікаў дасягнуў 6-ці тысяч.

У зьвязку з новымі паведамленьнямі друку, нібыта 1.700 гарнякоў спынілі забастоўку, орган французкае кампартыі «Юманітэ» падкрэсьлівае заяве амае перабольшаньне фактаў у афіцыйным артыкуле і заявае, што ў забастоўцы ў райёне Луары ўдзельнічае не 11, а 20 тысяч гарнякоў. Водлуг вестак «Юманітэ», урад спрабаваў зьвязацца на прадпрыёмай басэйну Гар, дзе разьмеры забастоўкі перабольшылі нават чаканьні арганізатараў. Урад дамагаўся частковых уступак на карысьць гарнякоў.

У зьвязку з ухіленьнем горнапрамысловаўцаў ад перамоў, цэнтральны стачачны камітэт басэйну Гар зьвярнуўся да прафэсту дэпартаманту з заявай, у якой выказвае гатоўнасьць назначыць даведацыю для перамоў з прадпрыёмцамі. Гэта, як растлумачвае „Юманітэ", зусім не азначае згоды падпачаліпа якому небудзь прымусоваму арбітражу ўлады.

Пладваро, некаторыя буржуазныя групы і, як відаць, нават рэфармісты (цэнтральныя органы якіх пакуль-што адмоўчваюцца, не выяўляючы сваіх адносін ні да забастоўкі гарнякоў, ні да забастоўкі тэкстыльшчыкаў у Алюнэ, якая цягнецца ўжо 15 ці тыдзень) намераны выкарыстаць выпадак, каб узьняць у заканадаўчым парадку пытаньне аб прымусовым арбітражы.

Орган Мільлерана «Аньэір» называе рух у паўдзённых пугольных басэйнах «камуністычнаю забастоўкаю» і бачыць у гэтым руху „руку агентаў Масквы".

ЗМАГАНЬНЕ СІРЫЙЦАЎ ЗА НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ.

КАНСТАНТЫНОПАЛЬ, 7-1. «Акшам» паведамляе, што ў зьвязку з прыездам у Сірыю французкага вярхоўнага камісара Понсо, па ўсім краі адбываліся масавыя дэманстрацыі з патрабаваньнем незалежнасьці для Сірыі. Такія-ж дэманстрацыі пад лёзунгам барацьбы за незалежнасьць адбыліся ў адказ на адозву ўтворанага французскаю ўладаю „перадпарляманту", якая прапанавала жыхарству «захаваць спакой і чакаць скліку парляманту». Урадавыя газэты Сірыі патрабуюць ужыць «рашучыя захады» проці нацыянальнага руху.

Бэсарабскі камітэт рабоча-сялянскага блёку пад судом.

ВЕНА, 8-I. Бэсарабскія газэты паведамляюць, што ў Кішынёве аддадзен пад суд увесь бэсарабскі камітэт рабоча-сялянскага блёку. Сябры камітэту аддаюцца пад суд на падставе закону аб ахове дзяржавы; яны абвінавачаны ў падбухторваньні да антыдзяржаўнае дзейнасьці на перавыбарчых сходах у Кішынёве.

Абавязковае навучаньне ў Турцыі.

КАНСТАНТЫНОПАЛЬ, 27-XII. У Канстантынопалі адчынена шмат школ для навучаньня лацінскаму альфабэту. Абавязковаму навучаньню падпадае ўсё жыхарства ад 16 да 40 гадоў. Побач з навучаньнем новаму альфабэту школы навучаюць асоб, якія зусім ня ўмеюць чытаць і пісаць.

ГАНДАЛЬ ЖАНЧЫНАМІ Ў КІТАІ

НА ГРУНЦЕ ГОЛАДУ.

ПЕКІН, 5-1. Прадстаўнік міжнароднага камітэту дапамогі галадуючым у Кітаі паведаміле з Сэйюну, што на грунце голаду ў паўночна-заходнім Кітаі продаж і навольніцтва жанчын набывае страшэнныя разьмеры. У адным раёне Сараці тысячы жанчын абернуты ў навольніц і накіраваны ў правінцыю Шансі.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ.

ПАЎСТАНЬНЕ ІНДЗЕЙЦАЎ ПРЫДУШАНА.

ПЬЮ-ЁРК, 6-1. Агенцтва „Асашыэйтэд Прэс" паведамляе, што эквадорскі ўрад прыдушыў паўстаньне 5 тысяч індзейцаў, якія атакавалі горад Рыё-Бамба.

Арышты ў Латвіі.

У сувязі з самазабойствам камуніста Самойлава ў дзень яго хаўтураў у Рызе а былося арышты сярод членаў кампартыі. П тым арышты пораніўліся ў Лібаву, Віндаву і Такум. Агулам латвійская палітычная паліцыя арыштавала звыш 20 камуністаў („Роботнік", № 6).

БУРЖУАЗЕЯ ІНДЫІ КАПІТУЛЮЕ ПЕРАД АНГЛ

Вынікі сацыялістычнага будаўніцтва да дзесяцігодзьдзя БССР.

(Даклад тав. Галадзеда на Юбілейнай Сэсіі ЦВК БССР 31-га сьнежня 1928 г.).

I. Гістарычнае значэньне дзесяцігодзьдзя БССР.

Гісторыя пралетарскай рэвалюцыі на Беларусі.

Таварышы! Гісторыя дзесяцігодзьдзя Савецкай Беларусі ёсьць гісторыя рэвалюцыйнай барацьбы пралетарыяту ва ўсім Савецкім Саюзе Сацыялістычных Рэспублік. Бальшавізм выяўляецца правесьнікам і арганізатарам рэвалюцыйнай барацьбы пралетарыяту і барацьбы за нацыянальнае вызваленьне раней прыгнечаных народнасьцяй. Ён залажыў аснову дзяржаўнаму строю і Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі. Рэвалюцыйныя рабоча-сялянскія масы Беларусі выяўляліся асноўнай сілай, якая ў злучэньні з мырокімі калрамі салдацкай масы акавалася галоўным аплотам для бальшавізму. Мясцовыя бальшавіцкія ячэйкі і тыя кадры бальшавікоў, якія былі загнаны царызмам на фронт імперыялістычнай вайны,—гэтыя кадры бальшавікоў і зьявіліся асноўнымі арганізатарамі працоўных мас ва ўсёй БССР—бальшавізм зьявіўся галоўным арганізатарам рабочае клясы.

Асноўнаю апораю для работы бальшавікоў на Беларусі быў Менскі Савет Рабочых і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў, які адразу пасьля Лютаўскай рэвалюцыі зьявіўся аплотам для ўсёй рэвалюцыйнай барацьбы бальшавізму. Менскі савет зьявіўся першым арганізатарам пад кіраўніцтвам бальшавікоў шырокіх рабочых, чырвонаармейскіх і сялянскіх мас. Адсюль і пачынаецца сапраўдная рэальная рэвалюцыйная барацьба за нацыянальнае вызваленьне Беларусі, якая раней была прыгнечана царызмам, царскімі чыноўнікамі і абшарнікамі.

Ленінскае вырашэньне нацыянальнага пытаньня

Калі мы гаворым аб 10-цігодзьдзі Савецкай Беларусі, то мы адначасова павінны гаварыць, і гаварыць у першую чаргу, аб рэвалюц. барацьбе за вызваленьне прыгнечаных нацыянальнасьцяй. Праграма партыі бальшавікоў ужо даўно, яшчэ 15 год таму назад адным з галоўных пунктаў сваёй рэвалюцыйнай праграмы ставіла пытаньне нацыянальна а самавызначэньня ўсіх народаў. Яшчэ ў 1913 г. Уладзімер Ільліч у сваім артыкуле, надрукаваным у «Праўдзе» 10-га мая 1913 г., пісаў: «Адзін толькі пралетар ят адстойвае ў нашы дні сапраўдную свабоду нацый і адзінства рабочых усіх нацый. Каб розныя нацыі вольна і мірна ўжываліся разам ці разыходзіліся (калі гэта ім удабней) складаючы розныя дзяржавы, для гэтага неабходны поўны дэмакратызм—дэмакратызм, які адстойваецца рабочай клясай Ніводнай прывілегіі ні для адной нацыі, ні для адной мовы! Ні малейшага прыгнечаньня, ні малейшай неправідловасьці да нацменшасьцяў!—Вось прынцыпы рабочай дэмакратыі»... («Праўда» № 106, 10 мая 1913 г.).

Так ставіў вялікі арганізатар бальшавіцкай партыі Уладзімер Ільліч Ленін пытаньне аб нацыялітыцы. Яшчэ далёка да Кастрычнікавай рэвалюцыі Цэнтральны Камітэт РСДРП (бальшавікоў) у сваёй пастанове запісаў ісчымі словамі праграму ў нацыянальным пытаньні аб поўным нацыянальным самавызначэньні. Бальшавіцкая партыя ставіла пытаньне нацыялітыкі так, як не магла ставіць ніводная ў той час сацыялістычная партыя. Цэнтральны Камітэт бальшавікоў на сваёй нарадзе з партыйнымі працаўнікамі летам 1913 г. у сваёй пастанове па нацыянальнаму пытаньню запісаў наступнае:

«Што датычыцца права прыгнечаных царскай манархіяй нацый на самавызначэньне, гэта значыць аддзяленьне і стварэньне самастойных дзяржаў, то сацыял-дэмакратычная партыя, безумоўна, павінна адстойваць гэтае права. Гэта патрабуюць як асноўныя прынцыпы міжнароднай дэмакратыі наогул, так і ў асаблівасьці нячуванае нацыянальнае прыгнечаньне большасьці насельніцтва Расеі, царскай манархіяй, якая прадстаўляе з сябе самы рэакцыйны і барбарскі дзяржаўны лад у параўнаньні з суседнімі дзяржавамі Зэўропы і Азіі»... (3 рэвалюцыі па нацыпытаньню, прынятай на нарадзе Цэнтральнага Камітэту РСДРП з партыйнымі працаўнікамі летам 1913 г.).

Так ставіла бальшавіцкая партыя 15 год таму назад пытаньне нацыялітыкі і вызначыла прынцыпы сваёй праграмы ў адносінах да прыгнечаных нацыянальных меншасьцяў былой царскай Расеі. Таму, калі мы гаворым аб нашым вялікім сьвяце, аб 10-годнім існаваньні Савецкай Беларусі, як са мастойнай дзяржавы, нам у першую чаргу неабходна успомніць, хто, як і калі ставіў пытаньне нацыялітыкі перад рабочай клясай. Калі розныя прадстаўнікі розных лібэральных, буржуазных і дробна-буржуазных партый высоўвалі лёзунг «культурнай аўтаноміі» тады Уладзімер Ільліч Ленін у сваіх артыкулах, выступаючы супроць таго вузкага нацыяналізму, які высоўваўся прадстаўнікамі гэтых партый патрабуючы «культурнай аўтаноміі», паставіў рубам пытаньне аб самавызначэньні розных нацыянальнасьцяў, назваўшы пастаноўку пытаньня аб «культурнай аўтаноміі», як прынцып самага яркага буржуазнага нацыяналізму. Толькі ў такой паставоўцы, якую зрабіў Ленін і ленінская бальшавіцкая партыя, пытаньне нацыялітыкі атрымала правільную пастаноўку.

Бальшавіцкая партыя па сваёй праграме адрозьнівалася ад усіх партый, існаваўшых у той час, ня толькі сваёй прынцыповай пастаноўкай пытаньня,—яна адрозьнівалася яшчэ і ў тым, што калі адны далей слоў ня ішлі, то бальшавікі і ставілі пытаньне і праводзілі яго ў жыцьцё. Партыя бальшавікоў сваю прынцыповую пастаноўку пытаньня аб нацыялітыцы цалкам ажыцьцявіла. Гэта здарылася таму, што бальшавізм выяўляўся і выяўляецца партыяй дзейнічаньня—тэй арганізацыяй, якая свае асноўныя прынцыпы рэалізавала ў жыцьці, і таму наша сьвята 10-гадовага юбілею існаваньня Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ёсьць вынік дзейнічаньня бальшавіцкай партыі, ёсьць вынік вялікай Кастрычнікаўскай рэвалюцыі.

БССР—дзіця Кастрычнікавай рэвалюцыі.

БССР, як дзяржава, ёсьць вынік сацыяльнай рэвалюцыі 1917 г. Гісторыя БССР ёсьць ня што іншае, як адна з мноствавых старонак вялікай Кастрычнікавай рэвалюцыі, ёсьць ні што іншае, як вялікі адрэзак рэвалюцыйнай барацьбы паўстаўшага пралетарыяту, барацьбы за камунізм і вызваленьне прыгнечаных працоўных мас. Адрозьніць гісторыю стварэньня БССР ад гэтай барацьбы ніякім чынам нельга. Кастрычнік выяўляецца фактычным ажыцьцявіцелем асноўных прынцыпаў у нацыялітыцы, вызначаных бальшавіцкай партыяй. Кастрычнік палажыў аснову нацыянальнаму вызваленьню разам з вызваленьнем пралетарыяту і працоўнага сялянства з-пад іга капіталістаў і абшарнікаў. Так, а ня інакш трэба разумець 10-цігодні юбілей існаваньня БССР, тым больш, што Беларусь, зьяўляючыся асноўным плацдармам вайсковых дзеяньняў у часе імперыялістычнай вайны, не магла ня прыняць удзелу ў гэтай барацьбе, у тым рэвалюцыйным руху, які зьяўляўся адзіным сродкам выйсьця з таго тупіка, у які працоўныя масы ня толькі былой Расеі, а і ўсяго сьвету былі заведзены буржуазіяй, былі заведзены імперыялістычнай вайной.

Рабочая клясa разам з бяднейшым сялянствам перамагла ў часе Кастрычнікавай рэвалюцыі таму, што яны пераканаліся ў таго тупіка, у які чалавецтва было заведзена буржуазіяй—гэта рэвалюцыйнае паўстаньне, рэвалюцыйны шлях, а ня згода з буржуазіяй, толькі і мог вывесьці народ на шырокі шлях сацыялістычнага будаўніцтва. Да гэтага заклікала партыя бальшавікоў. Пралетарская рэвалюцыя, адначасова вырашаючы клясавае пытаньне, вырашыла і нацыянальнае пытаньне. Адны гаварылі словы і гандлявалі народам—другія (бальшавікі) рабілі справу.

Імперыялістычная вайна яшчэ больш зруйнавала і да таго слабыя падставы народнай гаспадаркі былой Расеі і таму другога выйсьця з вайны ня можна было і чакаць, як толькі праз паўстаньне рэвалюцыйнага пралетарыяту. Паўстаўшы пралетарыят, які ішоў па бальшавіцкай праграме і зьявіўся тым сродкам, які вырашыў пытаньне аб выводзе з тупіка ўсіх працоўных, якія былі заведзены капіталізмам у безвыхаднае становішча як клясавых супярэчнасьцяў, так і супярэчнасьцяў паміж асобнымі капіталістычнымі дзяржавамі.

Такім чынам, рабочыя і сяляне Беларусі, працоўныя былой царскай Расеі, і тая вялікая армія, якая знаходзілася на тэрыторыі Беларусі і зьявіліся фактычнымі ўдзельнікамі нацыянальнага вызваленьня БССР.

Гістарычная дата.

Гістарычнай датай утварэньня Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі зьяўляецца дата, калі была вынесена пастанова VI-й абласной партыйнай канфэрэнцыі (1-м зьездам КП(б)Б) аб неабходнасьці абвяшчэньня вольнай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі.

30-XII-1918 году 1-ы зьезд КП(б)Б прызнаў неабходным абвясьціць самастойную Сацыялістычную Рэспубліку Беларусі, а VI-ю канфэрэнцыю перайменаваць у 1-шы зьезд КП(б)Б. Ад 1-га студзеня 1919 году вызначаны партыяй 1-шы Часовы Рэвалюцыйны Савецкі Ўрад БССР сваім маніфэстам агласіў, што: **«з гэтага моманту ўся ўлада на Беларусі належыць толькі Савету рабочых сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў..., прадажная Беларуская Рада з яе так званымі «народнымі міністрамі» абвяшчаецца па-за законам»**... Так гаворыць маніфэст 1-га Часовага Рабоча-Сялянскага Ўраду Савецкай Беларусі. Гэтымі двума актамі і паложана бесперапыннае існаваньне нашай Беларускай Дзяржавы.

Толькі рэвалюцыйны шлях разьвязвае цалкам нацыянальнае пытаньне.

Як ведаеце, таварышы, пытаньне аб Беларускай дзяржаве, разгаворы аб тым, каб Беларусь зрабіць незалежнай ад расейскага царызму падніміраліся ў розных нацыяналістычных колах і ўсялякіх іншых буржуазных беларускіх партыях, і што з часу Лютаўскай рэвалюцыі мары і словы аб стварэньні беларускай дзяржавы вы маглі чуць вяраз ад розных колаў. Але-ж поўнае вырашэньне гэтага пытаньня магло ажыцьцявіцца толькі рэвалюцыйным актам рабоча-сялянскіх мас Савецкай Беларусі з дапамогаю ўсяго пралетарыяту былой Расеі і Чырвонай арміі, у якой былі сабраны ў той час лепшыя сілы працоўнага рэвалюцыйнага народу.

Мы ведаем, што шмат хто «імкнуўся» розным шляхам агаласіць вольнасьць Беларусі. Беларускаму народу ад прадстаўнікоў буржуазных нацыяналістычных партый прапанаваліся іншыя шляхі арганізацыі Беларускай дзяржавы, шляхі, якія падтрымліваліся сусьветнай буржуазеяй і імперыялізмам.

Мы ведаем, што многіх не хацелася ісьці па праграме Кастрычнікавай рэвалюцыі, па праграме бальшавізму і што ў час паміж Лютаўскай і Кастрычнікавай рэвалюцыямі, а таксама і пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі былі ня толькі гутаркі аб тым, каб арганізаваць „самастойную" беларускую дзяржаву з дапамогаю буржуазеі Захаду, але і больш таго было, як бы многім вядома, імкненьне знайсьці вырашэньне задач аб стварэньні Беларускае дзяржавы з дапамогаю нямецкага кайзэра Вільгельма 2-га. Мы бачым, што тады, калі партыя, калі шырокія рабоча-сялянскія масы, калі пра етарыят рэальна вырашаў задачу стварэньня вольнай Беларускай дзяржавы, цесна зьвязанай з братэрскім Саюзам, з іншымі пралетарскімі савецкімі дзяржавамі, у тыя часы знаходзіліся такія прадстаўнікі беларускай нацыі, якія пачалі гандляваць беларускім народам, і гандаль гэты заключаўся ў тым, што яны думалі перапрадаць беларускі народ ад імператара расейскага кайзэру нямецкаму, і што яны аб гэтым прасілі Вільгельма 2-га, каб ён прыняў пад сваё яснавяльможнае пакраўіцельства беларускі народ і дапамог яму выйсьці з-пад цяжару бальшавізму, з-пад цяжару таго паўстаўшага пралетарыяту, які раз назаўсёды скінуў капіталізм, клясавую і нацыянальную прыгнечанасьць.

Міжнароднае значэньне нашага сьвята.

Таварышы! Калі мы гаворым аб 10-цігадовым юбілеі Савецкай Беларусі, нам трэба перш за ўсё памятаць, што наша сёньнешняе сьвята і значэньне нашага юбілею ня могуць абмежавацца толькі рамкамі нашае дзяржавы, гэта ёсьць сьвята і юбілей, якія выходзяць далёка па-за межы ня толькі Савецкай Беларусі, а нават і Савецкага Саюзу.

Наша сьвята па праўдзе мае міжнароднае значэньне, бо Беларуская дзяржава ўжо занесена на сусьветную геаграфічную карту, як частка вялікага непераможнага Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, бо нікому ня ўдасца ніколі выкрэсьліць нашу дзяржаву з сусьветнай геаграфічнай карты, ня ўдасца выкрэсьліць, што яна занесена на гэтую геаграфічную карту паўстаўшым пралетарыятам, яна занесена крывёю, што пралівалася ў часы Кастрычнікавай рэвалюцыі, у часы вызваленьня пралетарыяту і працоўных мас сялянства з-пад уціску капіталістаў і абшарнікаў.

Шмат хто з буржуазных дзяржаў, з прысьпешнікаў і лёкаяў міжнароднай буржуазеі прабуюць зьменшыць значэньне такога гістарычнага акту, як 10-гадовы юбілей БССР. Шмат хто з прадстаўнікоў фашысцкага друку ў Польшчы прабуюць замазаць значэньне нашага гістарычнага распасюджваньня ў сваім друку ўсялякай хлусьні аб нейкім нібыта непакоі ў Савецкім Саюзе і ў асаблівасьці ў Савецкай Беларусі. Мы-ж ім адказваем, што замазаць сусьветнае значэньне нашага гістарычнага юбілею, юбілею пралетарскіх перамог на фронце барацьбы за камунізм нікому ня ўдасца. (Воплескі).

Мары фашысцкага друку.

Я дазволю сабе агаласіць невялікую вытрымку з польскай газэты «Глос Правды», якая паказвае, да якой нагласьці даходзяць выдумкі фашысцкага друку, гэта значыць лёкаяў буржуазеі.

Вось што гэта газэта піша пад загалоўкам: „Паўстанаскі рух у Савецкай Беларусі".

«... Паўстанчаскія атрады «Беларускага таварыства братоў Расейскай Праўды» пачалі сваю зімовую антысавецкую кампанію, падзяліўшыся на маленькія групы; яны пачалі ўжываць асобныя акты сабатажу і індывідуальнага тэрору ў адносінах да прапаўнікоў дзяржаўнай адміністрацыі».

Як бачыце, пакуль што да гэтага часу мы ўсе жывы і здаровы.

... «Недалёка ад Гомеля адна з такіх груп была акружана вялікім атрадам ЧОН'у і разьбіта... Такую бойку паўстанцы павялі недалёка ад Лубінца. Сялянскае насельніцтва адмаўляецца плаціць падаткі. Ёсьць часта выпадкі зьбіваньня палаткових агэнтаў... Да многіх вёсак накіраваны экспэдыцыі. Каля Воршы сяляне цэлы дзень вялі сапраўдную бойку з вайсковым атрадам; разагнала іх кавалерыя, прыбыўшая з Воршы (сьмех). У м. Самахвалавічах сяляне пад кіраўніцтвам партызан напалі на магазын 34 С. палка (сьмех).

Партызаны выклікалі крушэньне цягніка, які вёз з Менску вайсковыя атрады ДПУ. Забітых тры, раненых—26 салдат (сьмех). Арыштаваны некаторыя афіцэры Чырвонай арміі. У Менску па прыгавору палявога суду расстраляны афіцэры Мядзьведзяў і Леванцоў; афіцэры Кісецкі, Піван і Глезар прыгавораны на катаргу на ўсё жыцьцё (сьмех)... Цэнтральная ўлада вельмі занепакоена разьвіцьцём падзей у Савецкай Беларусі і таму загадала сканцэнтраваць большую колькасьць войск ЧОН-у і атрады ДПУ ў гэтых райёнах».

А вось яшчэ да якой нагласьці даходзіць фашысцкі друк. «Газэта Варшаўская» піша:

«Вільня. Учора ў Вільні былі атрыманы весткі аб тым, што Савецкай ўладай у Менску быў разброен і арыштаваны 3-і батальён 6-га палка пяхоты, які ў часы сялянскага партызанскага паўстаньня адмовіўся ў часе бойкі выканаць загад. Батальён складаўся амаль што выключна з салдат-беларусаў, якія заявілі, што са сваімі братамі яны змагацца ня будуць».

Вось бачыце, таварышы, які паклёп узводзіць фашысцкі друк на рабочых і сялян. Трэба мець на ўвазе, што гэты паклёп мае цесную сувязь з былымі заявамі асобных заяваод польскай дзяржавы, якія марашь аб пашырэньні сваіх абшараў, так што гэта ёсьць крапіг аднэй і тэй-жа кампаніі—падрыхтоўкі, шляхам ашуканьня свайго насельніцтва, да тых задач, якія ставяць перад сабою фашысты, задач вайны, якую эўрапейскі імперыялізм рыхтуе супроць СССР. А мы ім, таварышы, скажам, што рабочыя і сяляне Савецкае Беларусі думаюць зусім іншае, чым думае фашысцкі друк: рабочыя і сяляне БССР думаюць, што яны сёньня, як ніколі, згуртаваны адзінай воляю і адзінай цьвёрдай магутнай сілаю, якую яны кладуць на выкананьне задач будаўніцтва сацыялізму; мы ім скажам, што 6-ы полк і яго батальёны, і ўся Чырвоная армія, як ніколі, зьяўляецца магутнай і адзінай (воплескі); і што нашыя посьпехі за дзесяць год да нашага юбілейнага сьвята зьяўляюцца посьпехамі ня толькі на фронце гаспадорчага і культурнага будаўніцтва, але яны незьмерна вялікія і ва ўсіх галінах жыцьця і працы рабочых і сялянскіх мас БССР.

Мы маем значныя посьпехі і па лініі узмацненьня палітычнага блёку, палітычнага саюзу рабочых і сялян, і што як рабочыя, гэтак і сяляне прасякнуты аднэй ідэяй—ідэяй будаваць сацыялізм. Мы ўпэўнены ў тым, што калі хто-небудзь паспрабуе закрануць нашае мірнае будаўніцтва, дык ён убачыць усю нашую моцнасьць, і ўсе імкненьні фашыстых разабіцца аб нашыя сталёвыя грудзі (воплескі).

Рабочыя і сяляне Савецкай Беларусі добра ведаюць тое, што яны зьяўляюцца першым атрадам, першым аванпостам вялікага Савецкага Саюзу.

Мы заўсёды памятаем і будзем памятаць, што Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік можа заўсёды палажыцца на нашае адзінства, на нашу згуртаванасьць і на нашую моцнасьць. Саюз ССР, неадымнай часткай якога мы зьяўляемся, можа заўсёды быць упэўнены ў тым, што яго пераданы вартаўнік—рабочыя і сяляне Беларусі, што жывуць на руінах СССР в захоплена-капіталістычным сьветам,—заўсёды будуць на варце заваёў Кастрычніка (воплескі).

II. Вынікі будаўніцтва сацыялізму за 10 год.

Цяпер дазвольце спыніцца на тым, якія мы маем фактычныя вынікі на фронце гаспадарчага і культурнага будаўніцтва да нашага 10-цігадовага юбілею. Каб уявіць сабе тую вялізарную розьніцу, якае адваляе нас ад ранейшых часоў, нам трэба ўспомніць, з чаго мы пачалі будаваць; бо гэтага нельга яскрава выявіць нашыя практычныя дасягненьні ў будаўніцтве. Усім нам вядома, што ў спадчыну нам дасталася ня вельмі многа. Гаспадарка Беларусі знаходзілася на ўсім нізкім узроўні. Сельская гаспадарка мела характар тыповай трохполкі, з захаваньнем у шэрагу райёнаў пераложнай сыстэмы; нашая прамысловасьць мела, як нам вядома, саматужны тып, прычым яе ўдзельная вага была нязначная. Пралетарская база ў зьвязку з гэтым была вусім мізэрная,—усяго 20 тысяч рабочых было ў прамысловасьці Беларусі да рэвалюцыі. А калі дадаць яшчэ тое, што гэтая нізкая на ўзроўню гаспадарка была вынішчана амаль што вусім, дык вам стане ясна, што мы пачалі будаваць сацыялізм на пустым месцы.

Усім нам вядомы 1919-1920 г. г., калі акупацыя, а таксама бандытызм, які панаваў пры дапамозе капіталістычных дзяржаў, яшчэ больш падарвалі падставы нашай гаспадаркі. Акупацыя яшчэ больш зруйнавала гаспадарку Беларусі. Каму не вядома зруйнаваньне г. Менску? Каму невядома зруйнаваньне Барысава, як пралетарскага асяродку? Каму з нас не вядома зруйнаваньне дзесяткаў і соцен вёсак, пасьля чаго не засталося дрэва на дрэве. Каму не вядома з вас, што транспарт быў цалкам разбураны; напрыклад, адных толькі мастоў на чыгунцы было ўзарвана ў 1920 годзе 158 (на Заходняй чыгунцы—124 масты і на МБВ—24). Жыльлёвая плошча і плошча, якая абслугоўвала гаспадарчыя патрэбы транспарту, была зруйнавана ў разьмеры 21 тыс. квад. мэтраў—гэта толькі на адным транспарце. Гэта жудасныя лічбы зруйнаваньня па аднаму толькі транспарту.

Вось тое, што нам засталося ў спадчыну, на падставе чаго мы пачалі фактычна будаваць сацыялізм. Засталіся руіны, засталіся тыя пажарышчы, якія стварыў бандытызм і акупанты. Вось на гэтым фоне нам прышлося аднаўляць нашую народную гаспадарку.

Што сяляне атрымалі ў выніку рэвалюцыі

Мы ўсё-такі, ня гледзячы на цяжкія зруйнаваньні гаспадаркі, маем такія дасягненьні і так далёка пашлі наперад, што нават самаму гэніяльнаму мастаку не ў пару будзе ў кароткіх словах выявіць яскрава тыя вялізарныя дасягненьні, якія Беларусь, рабочыя і сяляне Беларусі маюць у сучасны момант.

Трэба было-б напісаць некалькі томаў, каб яскрава адлюстраваць працэс нашага будаўніцтва, каб адлюстраваць той магутны энтузіязм, які выяўлен рабочымі і сялянамі на працягу апошніх гадоў у будаўніцтве народнай гаспадаркі і культуры Беларусі. Але і тыя невялікія лічбы, якія я думаю вам прывесьці, таксама могуць служыць пацьвярджэньнем нашых дасягненьняў на фронце будаўніцтва сацыялізму. Напрыклад, калі ўзяць такое пытаньне: што сяляне атрымалі ад Кастрычнікавай рэвалюцыі, што яны атрымалі ад таго, што на Савецкай Беларусі ўзмацнілася савецкая ўлада, замацавалася дыктатура пралетарыяту? На гэта можна адказаць наступнае: калі раней абшарніцкія і манастырскія землі складалі 58,9 проц. усёй зямлі, сялянскія землі займалі толькі 41 проц., дык зараз сялянскія землі займаюць 72 проц. усёй сельска-гаспадарчай плошчы, і толькі 20 проц. (у тым ліку і лясная плошча) належыць да дзяржаўнай гаспадаркі. Такім чынам, каля 2 млн. дзесяцін зямлі сяляне Беларусі атрымалі ад Кастрычнікавай рэвалюцыі. Гэта ёсьць першае дасягненьне. Другое: мы маем значны рост валавай прадукцыі сельскай гаспадаркі. Валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі за гэтыя гады вырасла да 795425 тыс. руб. у год, у той час, як у параўнальных лічбах за год да вайны яна складала ад 370 да 400 млн. руб. Рост, як бачыце, вялізарны.

Калі ўзяць рост пасеваў, які мы маем за 10 год, дык мы бачым, што пасеўная плошча складае 125,8 проц. супроць плошчы даваенных часоў. А калі параўнаць з тымі гадамі, калі тут на Беларусі разгульвалі акупанты і бандытызм, дык мы маем надзвычайна вялікія дасягненьні. Пасеўная плошча ў 1921 г. супроць 1916 году ўпала з 2300 тыс. дзесяцін, якія былі ў 1916 годзе, да 1800 тысяч дзесяцін, альбо акупацыя і бандытызм скарацілі пасеўную плошчу нашай сельскай гаспадаркі на 55 проц. Зараз ужо мы ў параўнаньні з даваенным часам маем вялізарны рост. Вось маем далей рост жывёлагадоўлі. Жывёлагадоўля ў сваім росьце ў пераводзе на буйную жывёлу складае 137,5 проц. ад даваеннага ўзроўню.

Трэба адзначыць, што за апошнія гады савецкая дзяржава зрабіла значныя капітальныя ўкладаньні ў сельскую гаспадарку. За апошнія гады было ўкладзена ў сельскую гаспадарку па дзяржаўнаму бюджэту і крэдыту 56 млн. руб., а ў бягучым гаспадарчым годзе намечана ўкласьці ў сельскую гаспадарку—гэта за адзін год—34,6 млн. руб. Як бачыце, такіх капітальных мерапрыёмстваў па ўздыму сельскай гаспадаркі ніколі не праводзілася да ўзмацненьня дыктатуры пралетарыяту і савецкай улады.

Аграмадны сэктар сельскае гаспадаркі да валавай прадукцыі складае 6,8 проц., а па таварнай прадукцыі—9,8 проц. Як бачыце, таварышы, гэта асабліва важна, што мы ня толькі расьцём па сельскай гаспадарцы супроць даваенных часоў, але і расьцём у бок сацыялізму. Нават у сельскай гаспадарцы, дзе панавала і зараз пераважна панае дробная вытворчасьць, дзе няма буйных гаспадарак, мы таксама маем посьпехі у бок узмацненьня аграмаджаных элементаў, і ўдзельная вага аграмаджанага сэктару як па валавай прадукцыі, гэтак асабліва і па таварнай з году ў год расьце. Гэта зьяўляецца вялізарным плюсам. Я не гавару ўжо аб тай працы, якая праведзена па аб'яднаньню сялянскіх гаспадарак у вытворчыя кааперацыйныя аб'яднаньні. Я гавару, як кажуць, аб чыстых аб'яднаньнях у вытворчай кааперацыі, тут ідзе справа аб калектыўных гаспадарках і савецкіх гаспадарках.

Калі-ж возьмем і паглядзім рэканструкцыйныя працэсы сельскай гаспадаркі, дык тут таксама вызначыліся вялікія зьдвігі, а гэта асабліва важна, бо нашае аднаўленьне народнае гаспадаркі наогул, нашая адбудова не зьяўляецца звычайнай, адбудовай гаспадаркі пасьля вайны, як гэта трэба разумець аб росьце гаспадаркі капіталістычных дзяржаў. У нас аднаўленьне гаспадаркі праходзіць ня толькі ў простым параўнаньні з даваеннымі часамі, але мы аднаўляем нашу гаспадарку на вусім новых падставах: у нас гэта праходзіць у поўнай адпаведнасьці з тымі задачамі сацыялістычнай рэканструкцыі, якія мы праводзім ва ўсіх галінах народна-гаспадарчага будаўніцтва. Калі ўзяць працэсы рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, мы маем, як масавае зьявішча, шырокі і бурны працэс пераходу з трохполкі на шматпольле. Гэта зьяўляецца вялічэзным крокам наперад, гэта зьяўляецца вялічэзным крокам у агрыкультурных мерапрыёмствах.

Працэсы палепшаньня апрацоўкі зямлі ў нас могуць часткова вымярацца аднаўленьнем сельска-гаспадарчага інвэнтару. Працэс аднаўленьня інвэнтару, які мы маем, штогодна пашыраецца. Гэта відаць з пашырэньня рэалізацыі сельска-гаспадарчых машын і сельска-гаспадарчага інвэнтару наогул, аб чым сьведчаць наступныя лічбы: калі ў 1925-26 годзе нашыя адпаведныя органы рэалізавалі сельска-гаспадарчых машын і інвэнтару на 2 млн., дык у апошнім годзе мы рэалізавалі на 4 млн. Такім чынам, у два разы растуць мерапрыёмствы па аднаўленьню матэрыяльнай апрацоўкі зямлі. Гэта ёсьць асноўныя моманты рэканструкцыйнага зьдзьвігу ў метадах апрацоўкі зямлі. Калі ўзяць тое зьявішча, што да рэвалюцыі ня было ніводнага трактара, дык у гэтым годзе мы маем ужо сотні трактараў у сельскай гаспадарцы Беларусі. Гэта ёсьць асноўны залог сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, якая будзе праходзіць па вызначанаму партыяй і савецкай уладаю шляху.

Вынікі прамысловага будаўніцтва.

Якія канкрэтныя вынікі мы маем у галіне прамысловага будаўніцтва? Аб гэтым сьведчаць наступныя лічбы: удзельная вага прамысловасьці прадукцыі ў адносінах да прадукцыі сельскай гаспадаркі да вайны ў нас была вельмі нязначная—яна раўнялася ўсяго 10-12 проц.; у гэтым годзе мы ўжо дасягнулі павялічэньня ўдзельнае вагі прамысловай прадукцыі да 25,7 проц. Калі ўзяць рост валавай прадукцыі, дык мы можам адлюстраваць нашыя дасягненьні наступнымі лічбамі: агульны аб'ём валавай прадукцыі зараз ужо ацэньваецца у 275,2 млн. руб. (тут ідзе справа аб усёй прамысловасьці, у тым ліку і дробнай і саматужнай). Калі параўнаць з даваенным часам, дык рост валавай прадукцыі прамысловасьці ў сучасны момант супроць даваеннай вызьмерна вялікі. Агульны аб'ём валавой прадукцыі зараз ужо ацэньваецца, як было паказана, у 275,2 млн., а па прыблізных даных аб'ём валавай прадукцыі даваеннай прамысловасьці ў год вымяраўся лічбаю ў 60 млн. (Вылічэньні прыведзены па цэнах 1926-27 году).

Трэба адзначыць, што рост аб'ёму валавай прадукцыі прамысловасьці у значнай ступені залежыў і ад тых капітальных укладаньняў, якія праведзены намі ў прамысловасьці за мінулыя гады. Усяго, пачынаючы з 1925 да 1927-28 г. г., разам укладзена ў прамысловасьць 49,1 млн. руб.; у апошні-ж год будзе ўкладзена 32 млн. рублёў па рэспубліканскай прамысловасьці, 3,8 млн. па мясцовай прамысловасьці і 7,2 млн. па Асінбуд.

Як бачыце, мы ўжо прышлі да такога становішча, што гадавая сума капітальных укладаньняў у прамысловае будаўніцтва за апошні год вырасла настолькі, што яна амаль раўняецца ўсім нашым укладаньням за 4 мінулыя гады разам.

Тут яшчэ я прывяду наступныя характэрныя лічбы, якія, безумоўна, сьведчаць аб нашых вызьмерных дасягненьнях па будаўніцтву прамысловасьці, як і наогул аб дасягненьнях у народнай гаспадарцы. Напрыклад, на 1-га кастрычніка 1926 году ўвесь асноўны капітал нашай прамысловасьці ацэньваўся ў 30 млн. руб. Гэта значыць, уся капітоўнасьць асноўнага капіталу прамысловасьці ВСНГ ацэньвалася ў 30 млн. руб., а ў гэтым годзе мы ўкладаем толькі на капітальнае будаўніцтва па прамысловасьці ВСНГ 32 млн. ды плюс яшчэ, як было паказана вышэй, у мясцовую прамысловасьць і ў Асінбуд, у электрыфікацыю—11 млн. руб.

Як бачыце, мы зрабілі каласальны крок наперад. Мы праводзім у гэтым годзе ў канцы 10-цігодзьдзя існаваньня Савецкай Беларусі гадавых укладаньняў на індустрыялізацыю нашай краіны больш, чым за мінулыя тры гады разам, і больш, чым каштавалі увесь асноўны капітал нашай прамысловасьці ў 1926 г. Гэтыя лічбы гавораць аб віганцкім тэмпе нашага будаўніцтва. Гэта гаворыць за тое, што толькі пры ўмовах дыктатуры пралетарыяту, толькі тады, калі кіруе дзяржавай савецкая ўлада, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, мы маем такія магчымасьці па разгортваньню будаўніцтва сацыялізму. Калі прамысловасьць Беларусі і наогул усёй народнай гаспадаркі бачылі такія вялізарныя капітальныя ўкладаньні ў дарэвалюцыйныя часы? Гэтага, як вы ведаеце, ніколі ня было і не магло быць да таго часу, пакуль не замацавалася дыктатура пралетарыяту ў нашай дзяржаве.

Рост ліку рабочых за дзесяць год мы маем наступны: у дарэвалюцыйныя часы нашая прамысловасьць, як я вам ужо сказаў, мела 20 тысяч рабочых, зараз у нашай прамысловасьці занята 45 тыс рабочых, а калі ўзяць з чыгуначнікамі і будаўнікамі, дык мы маем чыстых пралетарскіх кадраў як асноўную базу дыктатуры пралетарыяту, 83400 чал. Гэта агромністы рост. Пралетарскія кадры вырасьлі з 20 тыс да 83400. Гэта таксама ёсьць вялікі крок наперад.

Рост дабрабыту рабочых мас, што ў асноўным выяўляецца ў разьмеры іх пэнсіі, выяўляецца ў наступным, калі перавесьці ў параўнальныя велічыні заработную плату рабочых у сярэднім на месяц да вайны і ў сучасны момант, дык мы маем наступны малюнак: да вайны (у перавозе на чырвоную валюту) заработак быў у сярэднім 48 руб. у месяц, а ў сучасны момант сярэдняя месячная зарплата рабочага ўзрасла да 70 руб. (гэта было ўжо ў верасьні мінулага гаспадарчага году). Як бачыце, матар'яльны дабрабыт рабочых мас таксама расьце шпаркім крокам.

Рэканструкцыйныя працэсы ў прамысловасьці.

Што мы маем у галіне фактычнай рэканструкцыі прамысловасьці? Тут мы павінны вызначыць, што працэсы сацыялістычнай рэканструкцыі ў нашай прамысловасьці праходзяць значна шпарчэй і глыбей, чым у сельскай гаспадарцы. Я ня буду прыводзіць вам тых лічбаў, якія яскрава сьведчаць аб глыбокім працэсе сацыялістычнай рэканструкцыі прамысловасьці. Я павінен толькі адзначыць, што мы ўжо да канца 10-цігодзьдзя—да пачатку другога дзесяцігодзьдзя фактычна ўступілі на больш высокую ступень індустрыялізацыі БССР. Чым характарызуецца гэта вышэйшая ступенька, на якую мы ўжо сталі? Тым, што мы ад паўсаматужных прадпрыёмстваў, ад прадпрыёмстваў, якія апрацоўвалі толькі прадукцыю сельскай гаспадарки, перайшлі ўжо на станка-будаўніцтва. Для Беларусі, таварышы, гэта мае вялізарнейшае значэньне: там, дзе раней апроч саматужных майстэрняў і невялічкіх прамысловых прадпрыёмстваў нічога ня было, у Менску, у нашай сталіцы, зараз ужо мы будуем па заказах асобных саюзных сындыкатаў і трэстаў станкі для абсталяваньня нашай прамысловасьці. Гэта ёсьць ужо вялізарны крок наперад. Гэта значыць, што мы сталі на больш высокую ступеньку індустрыялізацыі БССР.

Праўда, удзельная вага нашай прамысловасьці ў народнай гаспадарцы БССР яшчэ невялікая, і мы значна адстаём ад сярэдняга ў

ВЫБІРАЕМ САВЕТЫ.

Усе працоўныя на перавыбарчыя сходы. Выбірайце ў саветы батракоў, беднякоў і сялянак, праявіўшых сябе на грамадзкай працы.

СВОДКА № 1

аб ходзе перавыбараў сельсаветаў за пэрыяд з 1-га па 5-га студзеня 1929 г. па БССР.

(Весткі даюцца па 10 раёнах па тэлеграфу).

1. Перавыбрана	17 сельсаветаў.		
2. Лік насяленьня ва ўзросьце 18 і вышэй гадоў	18.829 чалавек.		
3. З іх: пазбаўлена выбарчага права	314	„	1,7 проц.
4. Агульны лік выбаршчыкаў	18.515	„	98,3 „
5. З іх: жанчын	9.140	„	48,8 „
6. Зьявілася на выбары	10.428	„	56,3 „
7. З іх: жанчын	3.724	„	40,7 „
8. Усяго выбрана членаў сельсаветаў	334	„	— „
9. З іх. жанчын	71	„	18,5 „
10. ПА ПАРТЫЙНАСЬЦІ:			
а) камуністаў	28	„	7,3 „
б) камсамольцаў	35	„	9,1 „
11. ПА НАЦЫЯНАЛЬНАСЬЦІ:			
а) беларусаў	335	„	87,2 „
б) яўрэяў	24	„	6,3 „
в) расейцаў	6	„	1 6 „
г) палякаў	15	„	3,9 „
д) іншых	4	„	1,0 „

Першыя вынікі перавыбараў.

Перавыбары ў Продвінскім сельсавеце, Бабруйскага раёну, праведзены на трох вучастках.

Яўка выбаршчыкоў па кожным вучастку была наступная: Продвін—69,2 проц., жанчын 60 проц.; Глебава Рудня—75 проц. жанчын - 60 проц.; Баравая—72 проц. жанчын - 80 проц.

З абраных 6 членаў савету—жанчын—2, беднякоў—2, сераднякоў—4. А—ч.

Выбрыкі кулакоў і падкулачнікаў

(Рагачэўскі раён, Бабруйшчына).

Побач з актыўнасьцю і злучнасьцю бедняка з серадняком на выбарчых сходах ёсьць яшчэ цёмныя плямы сходаў, дзе падкулачнікі вёскі М.-Крушынаўкі, жадаючы сарваць сход, адкрыта застрашвалі на сходах беднату, як напрыклад, Рудзькаў Сілюк па гаспадарцы моцны серадняк, былы старшыня КСТУ, якога прагналі ў мінулыя перавыбары селькомаў за нявытрыманую антыбядняцкую лінію, якую вёў ён цэлы год і вось цяпер на выбарчым сходзе, пасьля зачытаньня наказу заявіў: „ну, беднота, ідзеце ў калектыў, чаго вы маўчыце?!“, а потым дадае: «паказ усё ахапіў, але гэта сядзе на нашу шыю».

Вадома, такой падкулацкай вылазцы беднота дала адпор, але гэта вельмі ўсхвалявала такіх як Рудзькаў Сілюк і калі пачалі галасаваць кандыдатуры бедняко ў, дык Рудзькаў і іншыя падкулачнікі крычалі: „не падымай за яго рукі“. У выніку такой адкрытай падкулацкай вылазкі ў члены сельсавету прайшлі апроч серадняко ў ваат заможныя, бедняка ў савет ніводнага ня выбралі, сьпіс выстаўленых беднатой быў правален, за выключэньнем двух.

Наказ не абмяркоўвалі, толькі спыталі, за чый кошт будуць праведзены гэтыя мерапрыемствы?

Такім чынам, блёк бедняка з серадняком быў разарваны, што сьведчыць аб кепскай працы сярод беднаты, а гэта дае повад звярнуць увагу на гэты вучастак працы. Я. К.

Да вынікаў справаздачнай кампаніі.

(Ліст з Гомелю).

Паступаючыя з месц весткі аб ходзе справаздачнай кампаніі саветаў паказваюць, што значная ўдзяла актыўнасьці насельніцтва. Асноўнымі пытаньнямі ў справаздачах былі высунуты: праведзімыя кампаніі на вёсцы (хлебазагатоўкі, сельска-асвадачная падатак, страхоўка, самаабкладаньне), пытаньні бо, ацьбы з натурамі і адміністрацыйная праца саветаў і кіраўніцтва вёскай. Справаздачы саветаў у значнай частцы будаваліся з пункту выкананьня наказу выбаршчыкаў. Асноўным недахопам у справаздачнай кампаніі зьяўляецца не прыцягненьне ўсіх членаў саветаў да справаздач, а у большасьці рабіці справаздачу старшыня і сакратар сельсавету. З гэтай прычыны асобныя сябры савету выступалі з крытыкаю працы савету і імкнуліся пазбавіць дакер'е насельніцтва да таго ці іншага сябра савету.

Справаздачнасьць рэвакамісій праходзіла амаль усюды адначасова з справаздачамі сельсаветаў. Былі выпадкі (Чачэрскі раён), калі рэвакамісіі трэба было прыцягваць да рэвізіі ўпаўнаважанага акрыканкому, бо яны да гэтага часу ніякай працы не вялі. У большасьці справаздачы рэвакамісій асьпятлялі фінансава-гаспадарчую працу сельсаветаў і ў некаторых выпадках працу сельсавету і яго сакцый.

На справаздачных сходах назіраліся выступленьні ўсіх пластоў насельніцтва, пры чым беднае і серадняком належала рашучая роля. Найбольшая ўвага ў выступленьнях на справаздачах сельсаветаў была зьвернута на пытаньні: недастатковае выкананьне наставоў агульных сходаў, асабліва па самаабкладаньню, суровая крытыка з боку беднаты працы савету, не праводзішчага ленасчая лінія, недастатковасьць працы сельсавету па палепшаньню сельскай гаспадаркі і недастатковая барацьба з ватравамі.

Кулакі нападалі на беднату, батракоў і кавуністаў, якія праводзілі вытрыманую ленасчую лінію ў працы. У селішчах Будка-Кашалёўскага раёну кулакі натрабавалі абіраць у саветы „людзей цвёрдых і разумовых“. Поруч з гэтым былі актыўныя выступленьні кулацтва на зрыў сходаў, выкрыстоўваючы для гэтага сваіх прыхільнікаў. Былі выпадкі экзамінігара ваўскі на беднату («кая дам хлеба ваат за грошы, нахай дае ваш хлеб кампэрацыя»).

Справаздачныя сходы ў большасьці праводзіліся ў выбарчых вучастках, маючых ня больш 300 выбаршчыкаў. Трэба адзначыць, што ў некаторых раёнах былі выпадкі, калі памяшканьне для сходу ня было своечасова падрыхтавана. У некаторых селішчах, галоўным чынам Веткаўскага раёну, кулакі прапанавалі скарыстаць для сходаў свае памяшканьні, заўважаючы пры гэтым: — у хаце бедняка столь вісіць над галавой, брудна і г. д.

У некаторых селішчах выбаршчыкі несваечасова атрымлівалі паведамленьне ў які дзень будзе сход. Таму ў залежнасьці падрыхтаванасьці хістаўся прогант прысутнічаючых выбаршчыкаў. У тых селішчах, дзе падрыхтоўчая праца была праведзена здавальняюча, наведваньне дасягала 65 проц., а там дзе падрыхтоўка была кепская—процант быў вельмі ніякі. У асобных селішчах прыходзілася склікаць сходы па некалькі разоў. Прысутнічаньне жанчын, у большасьці, даходзіла да 7 проц. і толькі ў некаторых селішчах Рэчыцкага і Уваравіцкага раёнаў—да 37 проц. Недастатковая яўка жанчын на справаздачныя сходы тлумачыцца: недастатковай працай сярод жанчын і недастатковай увагай да справаздачнай кампаніі часткі савецкіх органаў.

Пры праведзеньні справаздачных сходаў выявілася згрупаванасьць беднаты, прычым апошняя групавалася вакол партячэек, актыўных членаў сельсаветаў—беднякоў і была застрэльшчыкам у разгортваньні самакрытыкі. У асобных раёнах была праведзена здавальняючая праца з беднатой. Сходы беднаты праходзілі пры удзеле 60-65 проц. усіх запрошаных. На гэтых сходах асабліва высоўваліся пытаньні: артызізаны адпор кулацтву і падрыхтоўка кандыдатур у камісіі на складаньню наказу.

У некаторых вёсках Камарынскага раёну, дзе праца з беднатой была слабая, на справаздачных сходах з боку бядняка-серадняцкай часткі насельніцтва не выяўлялася актыўнасьць і справаздачы праходзілі пры ніскім удзеле. Трэба адзначыць, што ў некаторых селішчах недастатковая была праведзена праца з серадняцкай часткай насельніцтва. Былі выпадкі, калі на сходы беднаты не запрашалася лепшая частка актыву серадняка. Сельская інтэлігенцыя (настаўнікі, дактары, агрономы і г. д.) ухіляцца ў працу выбарчых камісій, прычым некаторая частка актыўна ўдзельнічае ў справаздачнай кампаніі.

Трэба дабіцца яшчэ большага згрупаваньня бядняцка-серадняцкай часткі насельніцтва вакол партячэек і саветаў, каб даць рашучы адпор кулаку, які спрабуе праціскуць сваіх прыхільнікаў у сельскія саветы. Н—в.

Яўку на выбарчыя сходы—павялічыць!

Выбарчая кампанія па Заслаўскім раёне пачалася з 2 студзеня. Першыя вынікі па 2 сельсаветах гавораць за здавальняючую яўку выбаршчыкаў на сходы, як напрыклад: на Ганусінскаму сельсавету ад 50 да 70 проц. і па Старасельскаму ад 50 да 60 проц. Аднак, гэты процант яўкі трэба лічыць недастатковым,—прымаючы пад увагу, што па гэтых 2 сельсаветах колькасьць выбарчых вучасткаў, у параўнаньні з мінулымі выбарамі, павялічана з 10 на 26, а па ўсяму раёну з 65 да 140 вучасткаў.

Асабліва недастаткова яўка жанчын, складаючая ў сяродніх калі 30 проц. усіх удзельнікаў выбарчых сходаў. Для большага ўдзелу выбаршчыкаў у выбарах, раённая выбарчая камісія для практыкі 2 вялікія вёскі, дзе мацца каля 300 выбаршчыкаў у кожнай,—падзяліла на 2 выбарчыя вучасткі, прычым у адной вёсцы будуць праведзены сходы на палову выбаршчыкаў з кожнае хаты, а ў другой—асобна сход мужчын і асобна жанчын. Такі метад арганізацыі выбарчых сходаў вырашыць пытаньне з памяшканьнямі з аднаго боку, а з другога боку, бязумоўна, павялічыць удзел выбаршчыкаў у выбарах.

Делегацкі сход жанчын Заслаўскага местачковага савету, разглядаючы пытаньне аб удзеле жанчын у перавыбарах саветаў, вынес пажаданьне—арганізаваць асобна выбарчы сход жанчын і у м. Заслаўі, дзе намечана правесьці выбары на палове выбаршчыкаў з хат, і узяў на сябе абавязак правесьці арганізацыйную працу сярод жанчын мястэчка аб яўцы іх на сход.

У тым выпадку, калі такі метад выбараў дасьць станоўчыя вынікі (а ён, бязумоўна, дасьць), то неабходна будзе і ў другіх, больш буйных выбарчых вучастках, па другіх сельсаветах, правесьці такі метад выбараў.

Адначасова неабходна адзначыць, што па некаторых сельсаветах практыкавалася раздача позваў для дарэчэньня выбаршчыкам, сялянам наведваючым сельсавет па розных справах і, ў выніку, па некаторых выбарчых вучастках, позвы ўручаліся несваечасова. Па гэтаму пытаньню раённай выбарчай камісіяй дадзена катэгарычная прапанова сельскім выбарчым камісіям, каб позвы даручаліся выбаршчыкам ніяк не пазьней, чым за 5 дзён да выбарчага сходу і выключна праз членаў сельсаветаў і спэцыяльна вызначаных сельскіх выканаўцаў, без перадачы другім асобам.

П. Ягаўдзік.

Усебеларуская краязнаўчая канфэрэнцыя

Фэналёгічныя нагляданьні ў краязнаўч. працы

(Даклад С. К. Жураўскага).

Фэналёгічныя нагляданьні зьяўляюцца адным з сродкаў вывучэньня прыроды мясцовага краю і яго біяклімату. Краязнаўчая фэналёгія вызначае пэўны абмежаваны круг зьяў у прыродзе, якія зьяўляюцца найбольш відавочнымі і даступнымі для нагляданьня. Фэналёгічныя нагляданьні краяведа абмяжоўваюцца пэўнай мінімальнай праграмай. Беларуская праграма фэналёгічных нагляданьняў ахапляе характэрныя ўласьцівасьці ў зьявах беларускай прыроды і клімату. Фэналёгічныя нагляданьні пажадана праводзіць у шчыльнай сувязі з метэоролёгічнымі. Правядзеньне фэналёгічных нагляданьняў патрабуе ад нагляльніка максымальнай уважлівасьці і дакладнасьці ў вызначэньні аб'екту нагляданьня і тэрміну зьявы. Фэналёгічныя нагляданьні даюць мясцовым краяведам багаты матар'ял для ўкладаньня сяроднягa календара прыроды мясцовага краю, што можа скарыстоўвацца для патрэб сельскае гаспадаркі. Абагульненьні фэналёгічных назіраньняў, праведзевых сыстэматычна і дакладна за некалькі год па ўсёй БССР, дадуць пэўны матар'ял для вызначэньня біяклімату Беларусі.

Складаньне райённага слоўніка мовы.

(Даклад М. І. Касьпяровіча).

Ва ўсякай галіне дзейнасьці ў краі неабходна мець у першую чаргу дакладнае ўяўленьне этнаграфічных асаблівасьцей яго і дасканала вазнаць мову мясцовага насельніцтва. Хутчэй за ўсё дайсьці да сьядомасьці дзіваў і селяніна ў навучаньні, або асьветнай гутарцы, ці разважаньні аб справе, можна толькі гаворачы на запраўды родным, мясцовым, а не літаратурнай мове. Пакуль ён не ведае той або іншы прадмет, датуль ня можа быць гутаркі аб штодзённым, а не кампанейскі ажыцьцяўленьні сувязі горада з вёскай, паглыбленьні нацыянальнай палітыкі і прыцягненьні шырокіх мас да савецкага будаўніцтва. Разам з тым здаровае ўзбагачэньне літаратурнае мовы можа ісьці толькі шляхам успрыйманьня мясцовых слоў літаратурнаю мовою, а ня выдуманьня іх. Побач з гэтым практычным, палітычным і лексыколёгічным значэньнем вывучэньне мясцовай мовы высьвятляе геаграфію слоў, дае магчымасьць навуковых дыялекталёгічных асаблівасьцей, выдадзе аб мінулым народу, яго быце, інтэлектуальным і гаспадарчым стане і г. д.

Усё гэта павінна прычыніцца таму, каб мясцовае райённае та-ва краязнаўства сіламі сваіх членаў сабрала і ўклала слоўнік мовы свайго раёну. Ды інакш, без укладаньня апошняга, вывучэньне свайго раёну ня было-б усебаковым, а якраз гэта ўсебаковае пазнаньне раёну ў мінулым і сучасным зьяўляецца канчаткам мэтаю кожнага раённага таварыства краязнаўства.

Мэдычна-санітарнае вывучэньне раёну.

(Даклад І. І. Цьвікевіча).

Трэба, папершае, палепшыць працу па навукова-санітарных досьледах беларускае вёскі, а падругое, гэтыя досьледы і асабліва ў апісаньні результатаў гэтых досьледаў увесьці пэўную сыстэматызацыю і адпастойнасьць у сэнсе агульнага падыходу да гэтае працы і ў сэнсе размеркаваньня матар'ялаў у апісаньнях. Калі навукова-санітарныя досьледы будуць ахапляць маштаб райёнаў, округ і ўсяе рэспублікі то, зразумела, што гэтыя сыстэматызаваныя і адпастойна расарпанаваныя матар'ялы значна лягчэй можна будзе выкарыстаць у сэнсе падсумаваньня агульных вываў і вылучэньня агульнага санітарна бытавога стану вашае вёскі і фізычнага стану яе насельнікаў. У далейшым гэтыя працы дадуць, паміж іншым, магчымасьць улажыць санітарную карту рэспублікі. Карта гэта будзе мець вялізарнае значэньне—навуковае і практычнае—як для ўстаноў рэспубліканскага маштабу, так і для паасобных працаўнікоў. Практыка зьбіраньня мэдычна-краязнаўчых матар'ялаў выключна шляхам анкет паказала, што 1) працаўнікі на мясцох прымушаны абмежавацца механічным запаўненьнем анкетных граф і ня могуць вывяліць свае ініцыятывы ў сэнсе вымярэньня і больш усебаковага асьвятленьня тых пытаньняў, якія часта зусім не прадугледжаны анкетай, 2) анкеты шлях найбольш падыходзіць для вывучэньня вузкіх акрэсьленых пытаньняў, якія могуць паўстаць у результаце агульнага вывучэньня становішча вёскі. Схема разьлічана ня толькі на спэцыялістаў—санітарных дактароў,—але на тое, каб працаўнікі розных спэцыяльнасьцей, касьлеДуючы вёску паводлуг паасобных разьдзелаў гэтае схемы, маглі, злучаючы результаты сваіх паасобных досьледаў, даць калектыўны і пэўны малюнак санітарна-бытавога становішча вёсак

Беларуская краязнаўчая літаратура.

(Даклад К. Гурэвіча).

Запікаўленасьць нашай краінай, якая назіраецца ня толькі ў нас, але і ў нашых суседзяў, зусім зразумелая, калі прыняць пад увагу сярэдзіннае палажэньне Беларусі паміж усходняй і заходняй часткамі Эўропы, мае вынікам багатую літаратуру, прысьвечаную нашай краіне. Яна распадаецца хроналёгічна на 2 розка выяўленыя групы: літаратуру дарэвалюцыйную і пасьлярэвалюцыйную.

У спадчыну ад мінулага нам застаўся параўнаўча нязначны лік сыстэматычных досьледаў, параўнаўча значная колькасьць больш-менш сырых матар'ялаў і шэраг прац папулярных і масавых. Характэрным для гэтай літаратуры зьяўляецца яе вытлянаваньне з аднаго боку і вядомы русіфікатарскі ўхіл, з другога. У колькасных адносінах за дарэвалюцыйныя часы літаратура пэрыядычна пераважае мавяграфічную, значна ўступаючы апошняй, зразумела, у навуковых адносінах.

Зусім іншае назіраем мы ў сучасны пэрыяд, пасьлярэвалюцыйны, калі вывучэньне Беларусі стала самамэтай, справай самога беларускага народу. Характэрным для літаратуры гэтага пэрыяду зьяўляецца: пяванасьць і сыстэматычнасьць досьледаў, увязка іх з экзамінчымі і культурнымі запатрабаваньнямі Беларусі, рост высокакваліфікаванай навуковай літаратуры, а таксама і рост літаратуры навукова-папулярнай.

Трэба, аднак, адзначыць, што, ня гледзячы на досыць значную лічбу літаратуры (больш 60000 назваў), мае яшчэ даволі бедную краязнаўчую літаратуру, асабліва па групе паасобных выданьняў.

Да конкурсу на лепшую сэкцыю гарсавету і сельскі савет.

НІВОДНАГА ПАСЬЛЯ ГАРСАВЕТУ ЧЛЕНА ГАРСАВЕТУ.

(Гутарка з старшынёй ЦСПСБ тав. Рыжовым).

Паводле пастановы ЦВК БССР з 1-га сьнежня па ўсёй Беларусі павінна была шырока разгарнуцца кампанія па правядзеньню конкурса на лепшую сэкцыю гарсавету, на лепшыя сельскі і мястачковы саветы з іх камісіямі.

Асноўнымі задачамі конкурсу зьяўляюцца праверка працы саветаў у галіне ажыцьцяўленьня імі ў сваёй штодзённай працы клясавай лініі савецкай улады, выяўленьне лепшых прыкладаў масавай працы саветаў і распаўсюджваньне іх на ўсе саветы БССР, а таксама максымальнае прыцягненьне працоўных мас да працы саветаў для яшчэ большага ажыўленьня дзейнасьці апошніх. Побач з гэтым ня менш важнай задачай конкурсу зьяўляецца выяўленьне ў працы саветаў бюракратызму, валакіты і іншых хваробаў зьнішчэньня і ўмацненьне ролі саветаў, як органаў дыктатуры пралетарыяту.

Бязумоўна, значная доля ў вырашэньні гэтых задач павінна належаць прафсаюзным арганізацыям і ўсёй прафсаюзнай масе. Між тым да сучаснага моманту як цэнтральныя праўленьні, так і нізавыя прафсаюзныя ячэйкі—фабзавіясцкомы—яшчэ недастаткова разгарнулі ў гэтай галіне працу і не ўдзялілі дастаткова ўвагі пытаньню правядзеньня конкурсу, захаваўшыся над абарону калдагавораў. Як цэнтральныя праўленьні, так і фабзавіясцкомы не пашлі ўсю масу членаў прафсаюзаў да справы конкурсу.

Справаздачная кампанія гарсаветаў, сельскіх і мястачковых саветаў павінна была ўвязвацца нашымі прафорганамі зьверху данізу з працай па выяўленьню лепшых саветаў, сэкцый і камісій. Справаздачная кампанія сельсаветаў і гарсаветаў навочна паказвала і паказвае працаздольнасьць таго ці іншага савету. На справаздачных сходах сельсаветаў выяўлялася і можна выявіць, як праламляліся 1 пралямляюцца ў даным савеце і камісіі пытаньні сацыялістычнага будаўніцтва, калектывізацыя сельскай гаспадаркі, кааперараваньне насельніцтва, падняцьце ўраджайнасьці тэй ці іншай вёскі, узмацненьне школьнага будаўніцтва і ініцыятыва ў апошніх сялянскіх мас. Справаздачная кампанія гарсаветаў і іх сэкцый павінна выявіць наколькі палепшаецца ўзмацненьне гаспадаркі гораду, камунальнае і жыльёвае будаўніцтва, дабрабыт гораду, наколькі палепшаецца становішча рабочых мас і ўцягненьне іх ў актыўную працу саветаў, у барацьбу з бюракратызмам, валакітай і іншымі хваробамі савецкіх апаратаў. Справаздачная кампанія павінна таксама дапамагчы выявіць наколькі выконваюцца дырэктывы аб выніжэньні накладных арганізацыйных і іншых выдаткаў; паказаць, што зрабіла адпаведная сэкцыя гарсавету для забесьпячэньня рабочага неабходнымі прадуктамі і г. д.

Перад нашымі прафарганізацыямі стаяць задачы—у самы кароткі тэрмін нагнаць упушчаную працу па правядзеньню конкурса на лепшы савет, сэкцыю і камісію апошняга. Трэба спыніць адгаворку, што калдагаворная кампанія перашкаджае разгортваньню гэтай вельмі важнай працы. Цэнтральным праўленьням саюзаў трэба тэрмінова праверыць працу фабзавіясцкомаў, трэба праверыць як яны прыступілі і праводзяць працу па конкурсу.

Фабзавіясцкомы павінны ў правядзеньне конкурсу ўцягнуць усіх членаў прафсаюзаў сваіх калектываў праз асобныя гутаркі, спэцыяльныя даклады на агульных сходах рабочых, праз насьценгазэту і клюбную працу. Перад нашымі фабзавіясцкомамі ў кампанію правядзеньня конкурсу стаіць лёзунг—**ніводнага пасьлянага члена прафсаюза.**

Побач з гэтым фабзавіясцкомы павінны дапамагчы рабселькораўскай армі ў гэтым конкурсе. **Рабселькоры маюць права вымагаць ад нізавых прафсаюзных ячэек дапамогі ў сваёй працы па выяўленьню лепшага савету, сэкцыі і камісіі.**

Недаацэнка важнасьці працы па правядзеньню конкурса з боку фабзавіясцкомаў пакажа няўменьне працаваць, няўменьне вырашыць задачы, якія стаяць перад рабочай клясай у галіне узмацненьня органаў дыктатуры пралетарыяту, а разам з тым і самой дыктатуры пралетарыяту.

Тыя фабзавіясцкомы, якія ня сумеюць правесьці працы па конкурсу, ня сумеюць у далейшым узмацніць і палепшыць сваю штодзённую працу. Праца па правядзеньню конкурса пакажа наколькі нашы нізавыя прафорганы ў патрэбны момант змогуць падняць грамадзкую думку аб'яднаемых імі калектываў на тых ці іншых задачах, якія могуць быць пастаўлены перад прафарганізацыямі, дзяржавай і дыктатурай пралетарыяту.

Ніводнага члена прафсаюза, які ня прымаў-бы удзелу ў правядзеньні конкурсу. Усе на конкурс!

Пакуль ня позна—падрыхтуйцеся!

(Ліст з Бабруйску).

Вялікая надбайнасьць да справы конкурсу выказана акруговай газэтай. Да гэтага часу газэта аб конкурсе не абгаварылася ніводным словам. Прадстаўнік газэты на пасяджэньні конкурснай камісіі выказаў нават думку, што гэта нібы і ня іх справа. Праўда, значную частку надбайнасьці газэты трэба ўскласьці і на конкурсную камісію, якая толькі 5-1 дала газэце канкрэтныя зазначэньні.

Акруговая конкурсная камісія арганізавана 19-XI, але першае сваё пасяджэньне склікала толькі 5-I. Дырэктывы мясцкому аб правядзеньні конкурсу не канкрэтызаваны; на 95 проц. яны зьяўляюцца перадрукам адпаведнай пастановы прэзыдыуму ЦВК. Пры перадрукаваньні дапушчаны нават грубыя памылкі: невядома з якой пастановы ўзята, што нібы камісіі садзейнічаньня конкурсу павінны арганізавацца і пры сельскіх саветах.

Уся справа па падрыхтоўцы да конкурсу ў Бабруйскім раёне скончылася адной пастановай, ня гледзячы на тое, што магчымасьцей палштурхнуць яе было шмат: увесь час раённы актыў па вёсцы ўдзельнічае ў справаздачах саветаў, а зараз і ў перавыбарах.

Даных аб арганізацыі камісіі садзейнічаньня конкурсу атрыманы толькі ад 3-х райвыканкомаў і аднаго гарсавету.

Як праведзіцца падрыхтоўка да конкурсу ў іншых раёнах—акрыканком ня ведае.

Параўнаўча невялікую падрыхтоўча-арганізацыйную працу да конкурсу правёў Бабруйскі гарадзкі савет 27-XI адбылася нарада старшынь сэкцый, у сьнежні месяцы на пленумах 2-х сэкцый, а адна сэкцыя на бюро, абмеркавалі пытаньне аб удзеле ў конкурсе; на справаздачных сходах дэпутатаў зачытвалася пастанова прэзыдыуму ЦВК па пытаньню конкурсу; сэкцыі ўжо склалі справаздачы аб сваёй працы, рыхтуюцца прапусьціць іх праз сходы выбаршчыкаў і толькі тады здадуць у друк.

Нажаль прыходзіцца канстатаваць, што акруговая конкурсная камісія прапусьціла шмат часу, які быў вельмі спрыяючы для правядзеньня конкурсу. Трэба як мага ўзяцца за арганізацыю грамадзкай думкі праз газэту, сходы, якія цяпер адбываюцца, скарыстаць усіх упаўнаважаных па перавыбарах, студэнцтва.

Усё гэта яшчэ магчыма.

Чаўрыновіч.

РЫХТУЕМ ВЁСЦЫ КААПЭРАЦЫЙНЫ АКТЫЎ.

У апошні час сыстэма спажывецкай кааперацыі зьвярнула вялікую ўвагу на падрыхтоўку кааперацыйных працаўнікоў як працаўнікоў крам, кааперацыйнага актыву, так і працаўнікоў па загатоўках сыравіны і г. д.

Словы т. Леніна —„Строй цывілізаваных кааператараў пры грамадзкай уласнасьці на сродкі вырабу, пры клясавай перамозе пралетарыяту над буржуазіяй—гэта ёсьць строй сацыялізму“—частка праводзіцца ў жыцьцё. Каб даказаць на справе ў умовах спаж. кааперацыі, як праводзіцца падрыхтоўка кааператараў, прывядзём некаторыя лічбы.

На 1928-29 год Белкаапсаюз арганізоўвае 2-хмесячныя курсы інструктараў, на што трацілася 6.000 руб. курсы для членаў праўленьняў, курсы мясьнікоў, курсы прапагандыстаў і шмат іншых. Акрамя гэтага, арганізаваны курсы для жаночага кааперацыйнага актыву; на гэтыя курсы будзе затрачана 6.000 руб.

Калі прагледзець сацыяльны склад курсаў, то можна заўважыць лепшых прадстаўнікоў актыўных батрачак і бяднячак з усіх куткоў беларускай вёскі.

На курсах займаецца 30 чалавек. За два тыдні да пачатку курсаў была склікана нарада выкладчыкаў, дзе растлумачана мэтавая ўстаноўка курсаў, якая зводзіцца да падрыхтоўкі лепшых батрачак на адказную кіраўнічую працу спажывецкай кааперацыі. На курсах жаночага кааперацыйнага актыву выкладаюцца як агульна-адукацыйныя дысцыпліны, так і спецыяльныя кааперацыйныя.

ЗЬЛЕВА НАПРАВА: 1. ШАЛКУНОВІЧ (працаўніца дзіцячых яслаў); 2. ВІШНЕЎСКАЯ (батрачка); 3. АЎРАМЧЫК (працаўніца ў кааперацыі).

Бытавыя ўмовы добрыя. Курсанткі вымяшчаюцца па 2-3 чал. у нумарох 1-й сав. гасьцініцы, атрымліваюць па 1 р. 06 к. у дзень на пражыцьцё, акрамя гэтага, выдаецца стыпендыя ў разьмеры 10 руб. у месяц, аплачваецца кошт прасаду на курсы і на месца працы.

Настрой курсантак добры; заўважаецца вялікае жаданьне вучыцца і працаваць, каб паказаць у вёсцы, што і жанчына можа працаваць на адказнай працы.

ЗЬЛЕВА НАПРАВА: 1. ЛЯДНІЦКАЯ; 2. ПРЖЭЛЯСКОЎСКАЯ (працавала ў Смалявіцкім кааператыве); 3. ДУБРОЎСКАЯ.

Сярод курсантак маюцца рабочыя з вытворчасьці, якія пасьля курсаў ідуць на працу ў вёску.

Можна з упэўненасьцю сказаць, што ў бліжэйшы час мы дамо вёсцы падрыхтаваных культурных працаўнікоў, кааперацыйна пісьменных.

Пажалаем курсанткам посьпехаў у вучобе і будучай працы на карысьць рабочых і сялян. Я. Крылавіцкі.

2 пазыка індустрыялізацыі рэалізавана.

Кампанія па рэалізацыі 2-й пазыкі індустрыялізацыі скончана. Кантрольная лічба для Беларусі ў 5200000 руб. выканана з правышэньнем больш чым на 100 проц.

Водлуг апошніх вестак Наркамфіну агульная сума падпіскі па БССР складае 8858690 р., апрача таго, падпіска на пазыку сярод чыгуначнікаў дала каля 2000000 руб. З агульнай сумы рэалізавана па раёнах і сельскіх мясцовасьцях на 2301960 рублёў.

Па асобных акругах вынікі рэалізацыі 2-й пазыкі індустрыялізацыі наступныя: Бабруйшчына—1052600 руб., Віцебшчына—1627600 руб., Гомельшчына—1151500 руб.; Меншчына – 2704200 руб., Магілеўшчына—794300 руб. Мазыршчына—450800 руб., Аршаншчына—655800 руб. і Полаччына—421600 руб.

Такім чынам можна лічыць што кампанія рэалізацыі пазыкі ў БССР прайшла з посьпехам. Зараз ідзе праца па своечасоваму замацаваньню за падпісчыкамі нумароў аблігацый, бо тыраж выйгрышаў па 2-й пазыцы індустрыялізацыі адбудзецца 26-27 студзеня. Гэта праца важна тым, што пры правядзеньні рэалізацыі 1-й пазыкі індустрыялізацыі былі выпадкі, калі нумары аблігацый замацоўваліся за падпісчыкамі пасьля правядзеньня тыражу выйгрышаў.

Другім момантам у бягучай працы павінна быць шырокая папулярызацыя і інфармацыя працоўных аб самім тыражы. Галоўная ўвага павінна быць зьвернута на забясьпечаньне падпісчыкаў хуткай і своечасовай інфармацыяй аб выйгрышах. Неабходна дабіцца того, каб падпісчык не хадзіў за справамі аб выйгрышах у фінансавыя ўстановы, а каб гэтыя спраўкі ён мог атрымаць у сябе на прадпрыемстве, або ўстанове. Камісіі садзейнічаньня пры прадпрыемстве не павінны спыняць сваёй працы, а паставіць перад сабой задачу—абслугоўваньне падпісчыкаў свайго калектыву.

Было-б добра пры кожным калектыве арганізаваць куток дзяржаўных пазык і забясьпечыць іх адпаведнымі матар'ялямі, як табліцы тыражоў, літаратура, плякаты і г. д.

Адначасова неабходна правесьці растлумачыцельную працу сярод падпісчыкаў каб апошнія не прадавалі сваіх аблігацый, бо ў апошнія часы ёсьць выпадкі прадажы аблігацый 1-й пазыкі індустрыялізацыі. Калі на гэта зьявішча ня зьвярнуць належнай увагі, дык фінансавыя вынікі, якія дасягнуты пры правядзеньні рэалізацыі пазыкі, будуць вельмі нязначнымі.

Камісіям садзейнічаньня трэба мець на ўвазе, што на правядзеньне тыражу дэлегацыі з месц выклікацца ня будуць, але мясцом даецца права камандыраваць сваіх прадстаўнікоў за кошт аблічэньняў, што атрымоўваюць камісіі садзейнічаньня. Пасылка дэлегатаў павінна быць узгоднена з адпаведнымі фінансавымі ўстановамі.

Пачынаюцца леташнія гісторыі.

Цяжкасьць загатоўкі валакна ў гэтым годзе відавочна для ўсіх. Нашымі регулюючымі і вышэйшымі органамі рэспублікі прыняты ўсе меры да зьнішчэньня якіх-бы там ні было непаразуменьняў у галіне загатоўкі лёну. Маецца цэлы шэраг дырэктыў, каб здатчыкам лёну выдавалі рэчы шырокага спажываньня на суму здачы ім валакна, зазначаецца на неабходнасьць падахвочваньня здатчыкаў лёну. Але нажаль ня ўсе разумеюць гэта, ня ўсе жадаюць зразумець і ўносяць страшэнны хаос у працу.

Сялянка вёскі Аляксандраўкі прынесла ў пункт Белдзяржгандлю ў Старыя Дарогі кудзелю, дзе ёй была выдадзена запіска, каб ёй неадкладна выдалі ў кааперацыі мануфактуру, у якой яна вельмі адчувала патрэбу. Яна прышла ў спажывецкую кааперацыю ў Старыя Дарогі, падала туды запіску і папрасіла на некалькі рублёў мануфактуры.

— Ведаць ня ведаем, на запіскі Белдзяржгандлю мануфактуры не выдаём, мы іх ня прызнаём, вось вам прынясі кудзелю і ты атрымаеш колькі твае душы ўгодна мануфактуры.

Сялянка плакала і гаварыла, што яна ня вела, што «нельга Белдзяржгандлю кудзелю здаваць».

— Не, не, гэта для вас кара, не насіце кудзелю чырвоным купцам.

І сялянка за сваю кудзелю мануфактуры не атрымала.

Маецца яшчэ шмат іншых фактаў.

Вось як спажывецкая кааперацыя разумее заданьне дзяржаўнае важнасьці.

Такія сумныя гісторыі мелі месца летась, аб іх шмат гаварылі, штат крычалі. Здавалася-б, што пасьля пастаноў Эканомнарады, СНК, НК Гандлю—кааперацыя павінна была кінуць гэтыя агідныя мэтады працы—зрыву загатоўкі лёну. Кааперацыі пара ведаць, што загатоўка валакна ў нашай прамысловасьці займае адно з першых месц, як у адносінах дастаўкі мясцовай прамысловасьці, так і ў адносінах экспарту, а яна сабе і ў вус ня дуе, разьвівае канкуренцыю, умаўляе сялян не здаваць зён Белдзяржгандлю.

НК Гандлю павінен заклікаць да парадку такіх кааператараў.

Л. Манін.

Падрыхтоўка да ўсебеларускае выстаўкі сельскае гасп. і прамысловасьці.

Дырэктар Выставачнага Камітэту т. Дубіна паведаміў нашаму супрацоўніку аб тым, як ідзе падрыхтоўка да ўсебеларускай выстаўкі сельскай гаспадаркі і прамысловасьці.

Памяшканьні для выстаўкі будуць будавацца ў райёне савгасу «Вялікая Сьляпянка», побач з рознымі дасьледчымі інстытуцыямі навукова-дасьледчага інстытуту сельскае і лясное гаспадаркі імя Леніна. Гэта робіцца дзеля таго, каб з часам выставачныя памяшканьні былі выкарыстаны дасьледчым інстытутам.

Зараз абвяшчаецца конкурс на пабудову выставачных памяшканьняў. Прымаюцца захады да загатоўкі будаўнічых матар'ялаў. Вясною адбудзецца закладка галоўных карпусоў.

Выставачны камітэт узьнімае пытаньне аб водпуску на будучы будаўнічы сэзон 300 400 тысяч рублёў. Зараз пачынаецца фармаваньне тэхнічнага апарату.

Як кансультант да гэтай справы прыцягваецца Беларускі Дасьледчы Інстытут, які будзе сачыць за тым, каб усе памяшканьні і будынкі адпавядалі сваім патрэбам.

Пабудова ўсяе выстаўкі будзе каштаваць 1.200 тыс. руб.

ВОДГУКІ НА КАРЭСПАНДЭНЦЫІ.

У адказ на заметку «Крымінальнікі ў сельсавеце»,—зьмешчаную ў № 242 нашай газэты за 19 кастрычніка г. г., Пракуратура паведамляе, што справы па абвінавачаньню старшыні Крывасёлкаўскага с.-с. Лабана Пятруся і сакратара Барыса Тамаша па 105, 107 і 116 арт. К. К. сьледствам закончаны і накіраваны Менакругу для прыцягненьня да адказнасьці; старшыня і сакратар з працы зьняты.

Згодна паведамленьня ЦП сачоў савгандлясужачых на аснове заметкі «Цяжкія часы», тав. Фейман зьнята з працы, а т. Анібух прынята на працу.

Па заметцы „Панская тройка" пад прыкладам сельсавету», надрукаванай у газэце «Сав. Беларусь», вытвараецца сьледзтва, прычым, факт захаваньня ад вучоту аб'ектаў абкладаньня пошчы саду Лявоўскім, Камароўскім і Фамыка пацьвердзіўся.

Бярэзінскі райвыканком паведамляе, што факты, дадзеныя ў заметцы «Самаабкладаньне правялі, а працы ў вэтпункце няма»—пацьвердзіліся і што вэтфельчар Ісаеў зьнят з працы.

Аб вробленых злоўжываньнях Ісаевым вядзецца сьледзтва на прадмет прыцягненьня яго да адказнасьці.

На падставе заметкі «Не казнэратыў, а хаўра п'яніц», па пытаньню аб Раванецкім спажывецкім таварыстве, Менскае адділеньне Белкаапсаюзу паведамляе, што факты п'янства расьсьледаваньнем пацьвердзіліся; дадзена распараджэньне аб зьмяншэньні з работы рахункавода і прыказчыка.

Расьсьледаваньне па заметцы «А мова і як дробязь» (С. В. № 156) рабілася Жлобінскім райпрафбюро з выездам на месца, дзе быў склікан агульны сход рабочых і адміністрацыі.

Райённым інспэктарам-рэвізорам была праведзена рэвізія Іванаўскага лясьніцтва, дзе пацьвердзіліся факты злачынства пэлага шэрагу працаўнікоў лясьніцтва, усе рэвізійныя матар'ялы накіраваны пам. пракурору г. Чэрвеня.

Пам. пракурора паведамляе, што заметка „Аб лепельскіх штукарох" («Сав. Бел.» № 178) пацьвердзілася. Пэнсія гр. Мінковай выплачана.

Пам. пракурора 4 вуч. Мен. округі паведамляе, што па заметцы „Галавацяны ў РВК» праведзена сьледзтва, устаноўлена, пераліска па справе каморніка Уласенка сапраўды згублена. Вінаватыя ў гэтым Карнюшка і Латоцкая прыцягнены да адказнасьці ў дысцыплінарным парадку.

З поваду заметкі ў газэце «С. В.» пад загалоўкам „Пад вывескай піва—горкая"— аб незаконнай продажы гр-кай г. Рагачова Рубанчык горкай акружпракуратура паведамляе, што гэтыя факты пацьвердзіліся. Вывесна пастанова гарсавету аб зачыненьні піўной, якую трымала гр-ка Рубанчык.

Па заметцы „Недапушчальнае зьявішча ў Калінкавіцкім с.-г. т-ве" („С. Б." № 175) аб злачынствах старшыні Гурло было вытворана сьледзтва, злачынныя дзеяньні апошняга пацьвердзіліся; Гурло зьнята з працы і аддадзен пад суд.

Пракуратура Менакругі паведамляе, што па заметцы „Чарнаўскі гнойнік" дасьледчы Чарнаўскага з-ва Жыхаровіч і абозчык Бурко зьняты з пасады. Справа будзе накіравана акр. суду.

У сувязі з тым, што шэраг фактаў, прыведзеных у заметцы «Далікатны загадчык ларка МЦРК № 13» (газ. «С. Б.» ад 9-X-28 г.) пацьвердзіліся, гр-н Ліўшыц—загадчык гэтага ларка—прыцягнецца да дысцыплінарнай адказнасьці.

Пракуратура Менакругі паведамляе, што справа на заметцы «Рэзізійную камісію загналі ў чарот», накіравана ў народ Койданаўскага р-ну.

Сакратарыят Менскага АВК паведамляе, што заметка „Самаабкладаньне правялі, а працы ў вэтпункце няма", накіравана Бярэзінскаму РВК для прыняцьця адпаведных мер.

Пракуратура рэспублікі паведамляе, што супроць Бондарэва, Цыганкова і Шэйлава,—заметка — „Пракуратура рэспублікі, зьвярні ўвагу"— (газ. «С. Б.» № 266 ад 20-XI-28 г.) была ўзбуджана крымінальная справа, і суд прызнаў Бондарэва Івана, Цыганкова Давіда сапраўдна небяспечнымі і забараніў ім пражываць на абшарах Беларусі ў працягу 4-х гадоў.

ЗАЎВАГА РЭДАКЦЫІ.

Пункт «б» пастановы бюро ЦК КП(б)Б аб выніках дыскусіі па тэатральных пытаньнях, надрукаван й у №2 нашай газэты, трэба чытаць так: «Спробы супрацістаўленьня нацыянальнай формы пралетарскаму зьместу шляхам выкоўваньня так званай тэорыі «самабытнасьці» зьяўляецца скажэньнем формулы партыі „Культура нацыянальная па форме і пралетарская па зьместу"—і прадстаўляюць сабой нацыянал-дэмакратычную ўстаноўку».

ХРОНІКА.

Падрыхтоўка да ленінскіх дзён.

Наркамасьветы зьвярнуўся да ўсіх акруговых інспэктарытаў і райённых інспэктароў асьветы з прапановай прыданьня шырокага масавага характару святкаваньню гадавіны сьмерці У. І. Леніна. Наркамасьветы прапануе ў дзень сьмерці Леніна вучэбных заняткаў не праводзіць, а правесьці з дзецьмі гутаркі і прапрацоўку матар'ялаў, зьвязаных з праведзеньнем ленінскіх дзён.

Уе ўсіх школах і дзіцячых садох запрапанавана скліканьць сходы бацькоў, на якіх правесьці гутаркі аб жыцьці і творах Леніна, увязаўшы іх з непасрэдным правядзеньнем перавыбараў сельсаветаў. Такія-ж гутаркі запрапанавана правесьці 21-га студзеня з дарослым насельніцтвам і моладзьдзю ў клюбах, нарадамах, хатах-чытальнях і чырвоных кутках.

Удзел спажывецкай каапэрацыі ў перавыбарах саветаў.

Белкаапсаюз зьвярнуўся з лістом да ўсіх спажывецкіх т-ваў БССР аб неабходнасьці ўзмацненьня ўдзелу ў справаздачна перавыбарнай кампаніі саветаў.

Запрапанавана арганізаваць за рахунак культфондаў адпадзённыя пасьвы, або плацёўні для дзяцей працоўных, з тым каб хатнія гаспадыні змаглі наведваць выбарчыя сходы. Райсаюзам запрапанавана тэрмінова накіраваць на вёску інструктароў для праверкі ўдзелу спажывецкіх т-ваў у выбарах саветаў. У час перавыбарнай кампаніі будуць зкліканы сходы актыву па пытаньнях аб актыўным удзеле пайшчыкаў у перавыбарах саветаў.

На гарадзкіх сходах на пантыку дзеяньняў будуць пастаўлены пытаньні аб пасылцы груп актывістаў на вёску дзеля дапамогі выбарам.

Удзел рабочых у аглядзе Чырвонай казармы.

У сувязі з аглядам Чырвонай казармы, цэнтральнае праўленьне саюзу камунальнікаў пастанавіла наладзіць масавыя экскурсіі рабочых у казармы чырвоных байцоў.

На прадпрыёмствах будуць праводзіцца гутаркі аб важнасьці агляду.

Усебеларускі тыдзень аўтадору.

Праўленьне аўтадору пастанавіла правесьці з пачатку вясны «усебеларускі тыдзень аўтадору».

У працягу гэтага тыдню міркуецца правесьці працу па арганізацыі новых ячэек, шырокага разгортваньня дзейнасьці арганізацыі аўтадору на мясцох і г. д.

Да гэтай працы будуць прыцягнуты настаўніцтва, сельсаветы, райвыканкомы і аграномы.

Рост ячэек Аўтадору.

У сучасны момант па БССР налічваецца 266 гарадзкіх, райённых і вясковых ячэек Аўтадору з агульнай колькасьцю сяброў 14000 чал.

Ячэйкі і акруговыя аддзяленьні Аўтадору маюць 16 уласных аўтамабіляў і аўтабусаў, 3 матацыклы і 2 маторныя лодкі. У многіх ячэйках маюцца гурткі па вывучэньню аўтамабільнай справы.

Аўтамабіль—за 50 кап.

Да гэтага часу на БССР распаўсюджана 64000 білетаў 1-й аўтамабільнай лётарэі Аўтадору. Па Менскай акрузе з гэтага ліку рэалізавана за 14000 білетаў.

Праўленьне Аўтадору штодзённа атрымлівае запатрабаваньні на высылку білетаў.

На апошнім пасяджэньні праўленьнем Аўтадору вынесена пастанова аб тым, каб кожны член Аўтадору рэалізаваў не менш 2-х лётарэйных білетаў, што дасьць магчымасьць рэалізаваць па БССР яшчэ да 30000 білетаў.

Абарона матар'яльных інтарэсаў г-н БССР за межамі.

За апошні час Беларускае т-ва Чырвонага Крыжу, якое ведае працу па абароне матар'яльных інтарэсаў г-н БССР за межамі сабрала для іх каля 400. 00 руб.

Апрача гэтага, зно дзена ў Амэрыцы Польшчы і іншых краінах больш 40 чал. якія лічыліся прапаўшчымі. Уся гэта праца вядзецца Чырвоным Крыжам бясплатна.

400 падлеткаў накіроўваюцца на прадпрыёмствы.

Згодна пастановы Савнаркому БССР Наркамасьветы даў распараджэньне па акругах накіраваць 400 падлеткаў-выхаванцаў дзіцячых дамоў на прадпрыёмствы ВСНГ Беларусі, прамкалектывы, Белсельтрэст і Белсельпрамсаюз.

Зацьверджана палажэньне аб жанкаапарганізатарах на вёсцы.

Праўленьне Белкаапсаюзу зацьвердзіла палажэньне аб жанкаапарганізатарах на вёсцы. Выдаленьне інстытуту жанчын каапарганізатараў пры спажывецкіх таварыствах ставіць мэтай узмацненьне працы на каапараваньню батрачак, бяднячак, сялянак і калгасніц. У абавязкі жанкаапарганізатараў уваходзіць права на пазыкаваньню каапараваньня жанчын, збор паявых узносаў, вядзеньне вучоту каапараваных жанчын, а таксама распаўсюджваньне каапарацыйнай асьветы сярод жанчын.

Страхаваньне батракоў.

Да апошняга году страхаваньне батракоў на БССР не правялося. Гэта праца распачалася толькі з мінулага году.

За год працы на Менскай акрузе застрахавана 2880 батракоў, што складае 50 проц. да агульнай колькасьці застрахаваных батракоў на БССР.

Добра праведзена страхаваньне батракоў па Пухавіцкаму раёну, у якім ахоплена 495 батракоў.

Новыя брыгады рабочых—у вёску.

У сьнежні месяцы ў часе справаздачнай кампаніі сельсаветаў, цэнтральная выбарчая камісія разам з ЦСПСБ паслала на месцы брыгады рабочых у ліку 100 чал.

Гэтымі дамі ЦСПСБ накіраваў на вёску 12 новых брыгад рабочых у складзе 50 чал. ад прадпрыёмстваў гораду Менску для ўдзелу ў самых перавыбарах сельсаветаў. Рабочыя, якія камандыруюцца на вёску, атрымоўваюць ад сваіх прадпрыёмстваў поўнасьцю сваю зарплату.

Адчыняецца санаторы „Чырвоны Кастрычнік".

25-га студзеня пасьля сталага рамонту адчыняецца сухотны санаторы «Чырвоны Кастрычнік» у Астрашыцкім-Гарадку.

У санаторы будзе знаходзіцца 85 хворых.

У санаторы міркуецца павялічыць колькасьць месц для сялян, а таксама выдзеліць некалькі месц для студэнтаў, інвалідаў.

Кошт мясного камбінату 2.500.000 руб.

У Маскве з удзелам „Хладоэкспарту" спэцыяльная нарада агульную суму пабудовы мясного камбінату ў Воршы вызначыла ў 2500000 руб.

У 1928-29 годзе на пабудову камбінату на бюджэту адпушчана 1200000 руб. і 100000 руб. банкаўскага крэдыту. Да 1 лютага ўсе чарнёжы і кашторысы па будаўніцтву мясного камбінату будуць распрацаваны і зацьверджаны.

Фізкультура і спорт.

Адчыненьне лыжнай станцыі і катка на чыгунцы.

Гэтымі днямі адбылося адчыненьне лыжнай станцыі і катка каля буфэту вакзалу МБД. На катку маюцца канькі, лыжы і інш. спартыўны інвэнтар.

Там-жа абстаўлена бегавая дарожка.

Сэзонныя білеты на каток.

У мэтах забясьпечаньня магчымасьці для гурткоў фізкультуры карыстацца катком саду „Прафінтэрн" па зьніжанай цэне, культаддзел ЦСПСБ устанавіў сэзонныя білеты для ўваходу на каток. Білеты будуць выдавацца выключна членам гурткоў фізкультуры. Кошт сэзонных білетаў—адзін рубель.

Групавыя білеты сёлета выдавацца не будуць.

Антырэлігійны маскарад на лёдзе.

У панядзелак, 7-га студзеня, на катку саду «Прафінтэрн» адбыўся антырэлігійны маскарад.

Удзельнічала звыш 300 чал.

Былі пралстаўлены каля 12 масак. Асабліва вызначалася маска—спартсмэн у трусіках, які на працягу некалькіх гадзін катаўся пры 12 градусным марозе.

Да арганізацыі нацменаўскіх вандроўных тэатраў.

На апошнім пасяджэньні калегіі Наркамасьветы выказана пажаданьне аб арганізацыі аўрэйскага і польскага дзяржаўных тэатраў для абслугоўваньня насельніцтва нацменшасьцяў. Пытаньне аб арганізацыі тэатраў перадасцца на зацьверджаньне Савэркому БССР.

Рост кіно-сеткі па БССР.

За апошні год адзначаецца вялікі рост кіно сеткі па БССР. Так, калі ў 1927 годзе па БССР налічвалася каля 100 кіноўстановак, дык на 1-га студзеня 1929 г. ужо мяецца 360 кіно-ўстановак. З гэтай колькасьці маецца 21 райённая, 100 клюбных і 80 кіно-перасовак, якія працуюць у самых глухіх кутках БССР.

Агляд працы вытворчых нарад.

Пастановай прэзыдыуму пры вучастковым прафсаюзе чыгуначнікаў арганізавана камісія ў ліку 5-ці таварышоў на дапамогу газэце «Правда» па правядзеньню агляду працы вытворчых нарад.

Гэткія-ж камісіі выдзелены і на больш буйных мясцовых чыгунках.

Выдача прадуктаў у крамах МЦРК.

З 6 студзеня на ўсіх крамах Менскага Цэрабкому пачалася выдача па ½ літра падсонечнага алею і па ½ кілё маннай крупы на кніжку. Манная крупа выдаецца ў рахунак месячнай крупяной нормы.

Новыя кнігі.

Паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя кнігі.

1. «Савецкая Будаўніцтва» № 11 за 1928 г. Штомесячны палітыка-эканамічны журнал Дзяржпляну БССР. Стар. 185, цана 1 руб.

Выданьне Дзяржпляну БССР. Менск.

2. «Плановое хозяйство» № 10 за 1928 г. Штомесячны палітыка-эканамічны журнал. Стар. 338, цана 2 руб.

Выданьне Дзяржпляну СССР. Масква.

3. «Наш край» № 12 за 1928 г. Штомесячнік Цэнтральнага Бюро Краязнаўства пры Інстытуце Беларускае Культуры.

Выданьне Інстытуту Беларускае Культуры. Менск.

Паштовая скрынка.

— Аўтарам заметак: «Пядобрыя гурткі» і «Памешчык і праваслаўнае абшчалі Немяніцкі с.-с.»—трэба пісаць свае ўласнае прозьвішча і адрас, без чаго матар'ял не друкуецца.

— П Гаранову—„Хлеб толькі дзяржаве".—С. Карлоўскаму—„Жанчыны на грамадзкай працы". А. Чужу—«Трэба больш застанаўляцца і высьвятляць вынікі рацыяналізацыі». - А. Вірэнскаму—«Як ідзе выкананьне хлебазагатовак».—І Іванову—„Аб дэмабілізаваных вайскоўцах».—„Крыўдо"—„Ганаровыя лескі».—А. Бамянту—«Страхавыя плацяжы пазічаны».—Э. Сеяву—„Мастацтва» сэзонных рабочых" —Усё ня пойдзе. Няма ніякіх фактаў—агульныя разважаньні.

Прахожаму. Шаця. Ваш допіс аб нацыянальнай сарожаньні пераслані ў Менскую акр. інспэкцыю нар. асьветы на расьсьледаваньне.

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня дакład тав. Пісарчыка „Выхаваўчая праца ў школе і дапамога бедняце". Пачатак а 8 гадз. Увечары. Уваход вольны.

— Заўтра, лекцыя тав. Усьпенскага—«Рэлігія і барацьба класаў». Пасьля лекцыі кіно «Кастусь Каліноўскі". Пачатак а 8 гадз. Увеч. Уваход вольны.

— 10-І г. г. а 7-й гадз. Увечары адбудзецца нарада сакратароў і прадстаўнікоў рабочай часткі РКК

Будзе разглядацца закон аб парадку разгляду канфліктных спраў у РКК і другіх прымірыцельна-канфліктных і судовых органах.

Яўка абавязковая і без спазьненьня.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

ТЭАТР—КІНО.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.
СЕРАДА, 9-га СТУДЗЕНЯ
ЗАЧЫНЕНЫ СПЭКТАКЛЬ.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». З аўторка 8 студзеня „ЛЯЛЬКА З МІЛЬЁНАМІ" камедыя ў 6 частках з удзелам ІГАРА ІЛЬІНСКАГА. Звыш праграмы—КІНО-ХРОНІКА № 47.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". Амэрыканскі баявік „ЭЛЕКТРЫЧНАЕ КРЭСЛА" Звыш праграмы—ХРОНІКА БЕЛДЗЯРЖКІНО № 46.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». З аўторка, 8-га студзеня „БЯЗБІЛЕТНЫ ПАСАЖЫР". з удзелам ОСІ ОСВАЛЬД.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ. Вячэрнія сэансы для дарослых „УДАЛЫ СКОК" камедыя ў 6 частках. Звыш праграмы—кіно-хроніка «Совкіно» № 60.

І-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО ТЭАТР «ЮНЫ ПІАНЭР». (Будынак кіно «ПРАЛЕТАРЫ»). Дзіцячы фільм вытворчасьці «Белдзяржкіно». „ЖЫВЫЯ ДАМЫ" у 5 частках. Звыш праграмы—кіно-хроніка „Совкіно" № 61. Штодзень 2 сэансы: 3 з пал. і 5 гадз. Цана білета 15 к.

КАНТОРА ГАЗЭТЫ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"

даводзіць да ведама падпісчыкаў,

што наступныя нумары лётарэйных білетаў

ня будуць прымаць удзел у розыгрышу лётарэі

15 студзеня 1929 году

З ПРЫЧЫНЫ АДМОВЫ АД ЗРОБЛЕНАЙ ПАДПІСКІ

НУМАРЫ БІЛЕТАЎ:

240, 241, 242, 243, 244, 245, 246, 247, 248, 249, 250, 251, 252, 253, 254, 255, 256, 257, 258, 259, 260, 261, 262, 263, 264, 265, 266, 267, 268, 269, 270, 271, 272, 273, 274, 275, 276, 277, 278, 279, 280, 281, 282, 283, 284, 285, 286, 287, 288, 289, 128, 126, 114, 127, 130, 1, 1101, 2593, 2595, 2589, 2250, 2332, 2366.

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА

Да пяцігодзьдзя сьмерці У. І. ЛЕНІНА

на ўсю літаратуру на беларускай, польскай, яўрэйскай, літоўскай, латыскай і іншых мовах

аб Леніне і ленінізьме

будзе даваццa з 10|I па 1|II-29 г. скідка ў 40 проц.

Літаратуру можна набываць ва ўсіх магазынах БДВ у Менску, а таксама ва ўсіх аддзяленьнях Белдзяржвыдавецтва.

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛЯНС

ГОМЕЛЬСКАГА КАМУНАЛЬНАГА ТРЭСТУ на 1 кастрычніка 1927 г.

АКТЫЎ.

НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	СУМА
I. Маемасьць	1905 14 87
II. Матар'ялы	184394—76
III. Тавары і гатовыя выробы	3714—08
IУ. Грашовыя сродкі	58489—79
У. Каштоўныя паперы	49—00
УI Паі і акцыі	560—00
УII. Абанэнцкольныя і дакум. да атрыманьня	38539—26
УIII. Недасправаздачныя сумы	16336—85
IX. Дэбіторы	271152—53
X. Нішэўныя і безнадзейныя даўгі	20089—84
XI. Нязкончаныя пабудовы	158458—80
XII. Нязкончаны капітальны рамонт	17825—86
XIII. Нязкончаныя мантажныя працы	80—52
XIУ. Выдаткі б/году	13297—07
XУ. Зьмяншэньне статутнага капіталу	2174—33
XVI. Выдаткі п/звароту	81—18
БАЛЯНС	2690858—74

ПАСЫЎ.

НАЗВА АРТЫКУЛАЎ		СУМА
I. Капіталы:		
а) асноўны	Руб. 1297622—17	
б) аваротны	„ 82537—67	
в) рэзервовы	„ 25609—31	1405769—15
II. Фонды:		
а) амортызацыйны	Руб. 235614—32	
б) палепш. быту раб.	„ 734—99	
в) нішэўн. даўг.	„ 19575—01	255923—42
III. Пазыкі і крэдыты (ссуды)		648624—55
IУ. Банкі па вуч. вэксэлёў		34062—46
У. Вэксэлі выдадзеныя		132054 36
УI. Крэдыторы		173309—23
УII. Падсн авазадачн. сумы		232—94
УIII. Павялічэньне статутнага капіталу		11382—45
IX. Прыбыткі б. году		539—64
X. Прыбытак за справаздачны год		28961—49
БАЛЯНС		2690858—74

ЗАБАЛЯНСАВЫЯ АРТЫКУЛЫ.

1. Дэбіторы па забясьпеч. Р. 337800—00		
2. Вэкс. атрым. у забясьпеч. 12706—50	350506—50	1. Вэксэлі выдадз. у забясьпеч. 337800—00
Па-за балянсавыя артыкулы.		2. Крэдыторы па забясьпечэньню 12706—50
1. Зямля	76848—00	350506—50

Рахунак прыбыткаў і страт Гомельскага камунальнага трэсту

ДЭБЕТ

ВІДЫ СТРАТ	СУМА
I. Эксплёатацыйныя выдаткі	707.073—15
II. Гандлёвыя выдаткі	17.957—27
III. Агульныя выдаткі	52.017—42
IУ %% аддачан.	3.312—22
У. Адлічэньні і рэзэрв:	
а) па нішэўных даўгох.	19.575—01
б) „ амартызац. фонду	14.525—35
УI. Сьпісаньне нішэўных даўгоў	6.393—43
УII. Розныя выдаткі	51.133—00
УIII. Стр та ад продажу тавару	1.263—69
IX. Страта па выбыўш. маемасьці	6.350—18
	881.600—72
Чысты прыбытак	28.961—49
БАЛЯНС	910.562—21

КРЭДЫТ

ВІДЫ ПРЫБЫТКАЎ	СУМА
I. Прыбыткі ад эксплёатацыі прадпрыёмства	828.396—68
II. Валавы прыбытак ад працаи. каўбаса. вырабаў	28.745—18
III. %%% атрыманы	1.691—28
IУ. Прыбыткі розныя	51.729—07
БАЛЯНС	910562—21

Згодна пастановы камісіі па зацьверджаньні балянсаў мясцовай прамысловасьці ад 30 мая—1-га чэрвеня 1928 г. чысты прыбытак за 1926-27 год у суме Р. 28.961.49 к. разьмеркаваны наступным чынам: 1) 1|10 проц. у капрыбытковы падатак —Р. 2896.14 к., 2) фонд палепшаньня быту рабочых Р 2606.53 к. і 3) астатнія Р. 23458.82 к. залічаны ў мясцовы бюджэт і абернуты ў пагашэньне запазычанасьці АКРФА за вулічнае асьвятленьне.

Кіраўнік камунальным трэстам СЯМЁНАЎ.

Галоўны бухгальтар КОДКІН.

Гэты баланс зацьверджан Гомельскім акруговым фінансавым аддзелам і да друкаваньня дазваляецца

АКРФА.

ПАТРЭБНЫ АГЭНТЫ

для збору падпіскі на часопісь „УЗВЫШША".

Агэнты за сваю працу атрымліваюць ганарар:

1) 50 кап. ад падпіскі на 1 камплект;

2) ад падпіскі на 10-ы камплект—75 к., на 25-ы—1 руб., на 50-ы—1 руб. 50 кап., на 100-ы—2 рублі за камплект.

АДРАС РЭДАКЦЫІ:

Менск, Савецкая 63, „УЗВЫШША".

Менскі ЗАГС выклікае на 8 лютага г. г. гр-ку Сьвірыдаву Марыю Язэпаву на справу скасаваньня шлюбу з гр-н. Сьвірыдавым Паўлам Сяргеевым.

ЗГУБЛЕНЫ.

— Каапэрац. кніжка Страх І. Х., выд. Мазырск. ЦРК.

— Каапэрац. кніжка Рэчыцкага М. Ф., выд. Мазырск. ЦРК.

— Конская картка Мардусэвіча А. А.

— Мэтрычн. выпіс Лапушчыка Б. Х.

— Дапрызыўная кніжка Шумака Л Л., выд. Слабадзкім РВК.

— Вучотная кніжка Філанава Г., выд. Нараўлянскім РВК.

— Сяброўская кніжка Цэмкіна С., выд. Мазырск. РВК.

— Мэтрычн. выпіс за № 215 Кацмана Ш. М., выд. Мазырск. Загсам.

— Каапэрац. кніжка Бугмаўца К. І., выд. Мазырск. ЦРК.

— Мэтрычн. выпіс Бэрман Э

— Каапэрац. кніжка Залёнка Г., выд. Мазырск. ЦРК.

— Асабовая кніжка і конская картка Чэрненкага Р., выд. Нараўлянскім РВК.

— Вучотная кніжка Шаўрэя В. Ф., выд. Калінкавіцкім РВК.

— Сяброўская кніжка Еранбурга М. М., выд. мазырск. саюзам будаўнікоў.

— Сяброўская кніжка № 275 Шмідт Г. З., выд. саюзам саматужнікаў, кв. 334.

— Мэтрычн. выпіс за № 446 Верамейка Э. П., выд. Мазырскім Загсам, кв. 335.

— Заліковая кніжка № 71538 Куіса М. В., выд. БДУ, кв. 336.

— Чырвонаарм. кніжка, пых. 5 стр. палком у 1926 г., 2) пасьвідчаньне на права нашэньня і каваньня «снагаў», выд. Менск. ОГПУ, на імя Пекарскага А., кв. 337.

— 3 біржавыя талёны Зільберштейна В. Г., выд. Менбіржай працы, кв. 338.

Замоўлітбел 302.

Менск, дзяржаўная друкарня

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ